Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

21 ЖНІЎНЯ 2019 г. СЕРАДА

№ 157 (29024)

ІНКЛЮЗІЎНЫ ФЕСТЫВАЛЬ, ДЗЕ ЎСЕ... АСАБЛІВЫЯ 4

ЯК ЗМАГАЦЦА СА ЗНЕШНЯЙ ДЭБІТОРСКАЙ ЗАПАЗЫЧАНАСЦЮ? 6

# ЗАКОН І ДАВЕР

## Жорсткая размова з прадстаўнікамі праваахоўных органаў павінна стаць гістарычнай

Фота Belta.

**У нас, грамадзян Беларусі, ёсць вельмі важнае дасягненне — бяспека. Нам не страшна хадзіць па вуліцах, мы спакойныя за сваіх дзяцей. Той, хто гэтага не мае, ведае, якая гэта каштоўнасць. Але як сярод прыбраній кватэры кідаецца ў вочы рэч не на месцы, так і факты, якія сведчаць аб праблемах у сферы аховы нашых правоў, мулюць вока і псуюць усю карціну. Кіраўнік нашай дзяржавы ўчора сабраў нараду па пытанні якасці работы праваахоўных органаў па выяўленні і расследаванні злачынстваў.**

### У аснове стабільнасці — давер

«Хачу, каб вы разумелі сутнасць сённяшняй размовы, — звярнуўся ён да ўдзельнікаў дзелавой размовы. — Я рэдка карыстаюся розната роду патэтыкай і высокімі словамі, але сёння скажу, што наша з вамі сустрэча ў рамках гэтай нарады павінна стаць гістарычнай. Гістарычнай у тым сэнсе, што тут, у гэтай зале, сабраліся ўсе тыя, ад каго залежыць суверэнітэт, незалежнасць нашай краіны, а ў аснове іх ляжыць стабільнасць. А ў аснове гэтай стабільнасці ляжыць унутрыпалітычная сітуацыя ў нашай дзяржаве і давер людзей да ўлады».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што на нарадзе сабраліся ўсе тыя, хто вызначае лёс краіны і лёс кожнага з яе грамадзян: «Ад нас з вамі залежыць, якой будзе краіна і як будуць жыць нашы людзі, і якімі будуць гэтыя людзі».

Нарада павінна стаць гістарычнай, бо сітуацыя з недахопамі ў праваахоўнай сістэме, пра якія пойдзе гаворка, павінна змяніцца кардынальна ў лепшы бок, падкрэсліў Прэзідэнт.

Нягледзячы на прэтэнзіі з боку грамадства і кіраўніка дзяржавы да сілавых структур, Аляксандр Лукашэнка палічыў неабходным пачаць з ацэнкі несумненнай заслугі, якая ім належыць. «Мы бачым, што адбываецца вакол нас. Нашы людзі, тым больш мы, калі бачым, што адбываецца ў нашых суседзяў, нашых братоў як на ўсходзе, так і на захадзе, часта кажам па-народнаму: дзякуй богу, што гэта не ў нас! Дзякуй богу, што мы не нарадзілі ў краіне клас алігархаў, якія не проста разрульваюць тыя або іншыя сітуацыі, але руляць краінай. Не дазволілі бандытам і злачынцам падзяліць краіну на часткі, «крышаваць» гэтыя часткі, паразітуючы на нашых людзях. Гэта найвялікшае дасягненне не толькі апошняга часу, але ўсяго перыяду незалежнай Беларусі. І гэта зроблена дзякуючы той палітыцы, якую праводзіць улада, і дзякуючы, у прыватнасці, таму, што робіце вы, прадстаўнікі праваахоўных органаў. Гэта галоўнае».

### Паказчыкі не важнейшыя за чалавека

Такім чынам, сістэма аховы правоў чалавека ў нашай краіне выбудавана і працуе. Але важна яе захаваць, залогам чаго з'яўляецца законнасць і справядлівасць у дзеяннях усіх яе прадстаўнікоў.

«У аснове нашай палітыкі заўсёды былі, ёсць і будуць чалавек і справядлівыя адносіны да яго, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Абарона правоў чалавека, яго жыцця — гэта першасная задача праваахоўнай сістэмы. А давер да гэтай праваахоўнай сістэмы з боку насельніцтва з'яўляецца адным з галоўных паказчыкаў эфектыўнасці, прафесіяналізму і законнасці дзейнняў усіх супрацоўнікаў сілавых органаў. Надзвычай важна гэты давер зберагчы, што немагчыма без самага строгага выканання закона».

Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў, што ў першую чаргу павінна быць забяспечана прэзумпцыя невінаватасці. І ў той жа час павінен працаваць прынцып непазбежнасці пакарання за злачынства. «Менавіта гэта патрабуе ад нас з вамі народ, на вернасць якому мы прысягалі. Тым больш што сёння праваахоўныя органы забяспечаны ўсім неабходным для работы. Таму людзі і дзяржава маюць права разлічваць на адпаведны вынік», — сказаў ён.

Але, на жаль, звароты грамадзян і праварпямняльная практыка сведчаць пра сур'ёзныя недахопы і пралікі ў рабоце аператыўна-вышуковых і следчых падраздзяленняў і пракуратуры.

«У людзей часам складваецца ўражанне, што сёння супрацоўнікаў праваахоўных органаў у першую чаргу цікавіць не жыццё і лёс чалавека, а лічбы і рэйтынгі, якімі вымяраецца эфектыўнасць іх працы, — дадаў ён. — Пры гэтым фальсіфікацыя ў ходзе расследавання крымінальных спраў такая, што лепш бы ы не заводзілі гэтыя крымінальныя справы!»

Кіраўнік дзяржавы лічыць, што тыя людзі ў пагонах, якія дапускаюць фальсіфікацыю падчас расследавання злачынства, не проста не павінны наседзіць пагоны, яны павінны быць выключаныя з грамадства раней за тых, чые справы расследуюць.

«Яшчэ горш, калі гэта суправаджаецца выкарыстаннем актыўных сілавых метадаў, несумерных сітуацыям, якія ўзнікаюць, — дадаў Прэзідэнт. — Бачыце, вяршыцелі лёсаў! Уварваўшыся ў дом, пры дзецях, цяжарных жонках, пакласці чалавека тварам на падлогу, як гэта ў вас прынята казаць, заламаць рукі, паламаць некалькі рэбраў... і гэта вяршыцелі лёсаў! Гэта бязмозглыя людзі, якім таксама не месца ў праваахоўнай сістэме!»

Яшчэ адна недапушчальная практыка — ціск на ўдзельнікаў крымінальнага працэсу: ад падазронага да суддзяў. «Гэта не забяспечванне законнасці. І гэта не адносіцца да таго крытэрыю, пра які я толькі што сказаў, — справядлівасці, — абурыўся кіраўнік дзяржавы. — Сёння мы павінны выявіць усе прычыны, з-за якіх падобнае становіцца магчыма. Вызначыць, што рабіць, каб не дапусціць у будучым парушэнне правоў грамадзян у нашай краіне».

Аляксандр Лукашэнка сказаў, што яго, у першую чаргу, цікавіць пазіцыя Генеральнай пракуратуры як вышэйшага нагляднага органа за захаваннем законнасці. Для поўнага і дакладнага бачання ўсёй карціны будзе таксама прадстаўлена і меркаванне Вярхоўнага суда. СТАР. 2

Фота Belta.

Стыхія

# СЕЗОН ВЕРАБ'ІНЫХ НАЧЭЙ

## У краіне прайшлі моцныя залевы з навальніцамі

**Каля 40 працэнтаў месячнай нормы ападкаў выпала за мінулую ноч у Ваўкавыску, паведамілі ў Распубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Дажджы ўначы з 19 на 20 жніўня прайшлі па ўсёй тэрыторыі Мінскай, Гродзенскай і Віцебскай абласцей, паўночна-заходніх і цэнтральных раёнах Брэсцкай вобласці. Больш за ўсё ападкаў за ноч выпала на метэастанцыі Ваўкавыск Гродзенскай вобласці — 29 міліметраў. Гэта больш за трацінy месячнай нормы — каля 40 працэнтаў. На другім месцы — Пружаны Брэсцкай вобласці — 27 міліметраў ападкаў.

Увечары 19 жніўня па тэрыторыі Мінскай вобласці прайшоў навальнічны фронт, які прывёў да перабояў у электразабеспячэнні некаторых населеных пунктаў рэгіёна. Па інфармацыі РУП «Мінскэнерга», усю ноч энергетыкі вялі аднаўленчыя работы, было задзейнічана 25 работнікаў і 12 адзінак тэхнікі. Да раніцы 20 жніўня ў большасці пацярпелых населеных пунктаў электразабеспячэнне было адноўлена.

Моцныя дажджы, месцамі з градам, прайшлі ў Брэсце, затапіўшы шэраг вуліц. Тут жа, у абласным цэнтры, падчас моцнай залевы задымілўся... аўтамабіль хуткай дапамогі. Па інфармацыі абласнога ўпраўлення МНС, здарылася гэта падчас руху. На месца выкліку накіраваліі пажарную спецтэхніку. Праз тры хвіліны ратавальнікі былі на месцы, аднак іх дапамога не спатрэбілася. Кіроўца «хуткай» самастойна справіўся з праблемай пры дапамозе парашковага вогнетушыцеля. Відавочна, пры выездзе машыны на выклік да пацыента падчас залевы адбылося кароткае замыканне электраправодкі ў салоне аўтамабіля. А выклік быў аператыўна перададзены іншай брыгадзе хуткай дапамогі.

Моцны ўраган прайшоўся ноччу 20 жніўня праз Глыбокае. У сецыве можна было пабачыць паваленыя дрэвы, слупы агароджы стадыёна, сарваныя дахі дамоў. Паведамлялася пра град у Зэльве... Але галоўнае, што ва ўсім гэтым разгуле надвор'я не пацярпелі людзі.

Сёння, 21 жніўня, па паўночным захадзе краіны абвешчаны аранжавы ўзровень небяспекі з-за навальніц, моцных ліўняў і парывістага ветру. Будзьце асцярожныя!

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Малая радзіма

Фота Анатоля ЮЁШКУКА.

# ФЭСТ У ЛЮБКАХ

**Калі коратка сказаць пра падзею, якую я здымаў мінулымі выхаднымі, то гэта проста: фэст на вясковым падворʼі ў фармаце ўспамінаў, душэўных пасядзелак і заліхвацкіх танцаў пад зорамі. Але я павінен растлумачыць, чаму менавіта ў вёсцы Любкі Вілейскага раёна і чаму ў такім фармаце адбываўся незвычайны фэст...**

Невялікая вёска Любкі летам ператвараецца ў дачны пасёлак — сюды на канікулы і адпачынкі вяртаюцца дзеці, унукі і праўнукі тых, хто будаваў хаты, гаспадарыў, гадаваў нашчадкаў, жыў сённяшнім днём і марыў пра «светлую будучыню», любіў свае традыцыі і святы. А фэсты і вяселлі тут былі даволі часта. Цяпер у Любках зімаваць застаюцца не болей за два дзясяткі чалавек пераважна старэйшага ўзросту, побыт якоўсюдна змяніўся, а нашчадкі ўжо не ведаюць ні гісторыі, ні традыцый, тым больш сваіх радаводаў, прозвішчаў, мянушак... А яны таксама «любэцкія» — як раней казалі пра жыхароў вёскі Любкі.

А вось жыхарка Маладзечна Вольга Трубач з такім станам спраў не згаджаецца і ўжо трэцяе лета на падворку свайго прадзеда Міхала Кабака (ён быў з роду Палюшыных) праводзіць адмысловыя фэсты.

Летась і пазалетась імпрэзы нагадвалі фальклорныя і танцавальныя маладзёжныя летнікі, а сёлетні фармат быў напоўнены клопатам узнаўлення духоўнай памяці і сувязі любчанскіх пакаленняў: каб унукі і праўнукі не адрываліся ад сваіх спрадвечных каранёў, не забывалі сваю малую радзіму і продкаў. Нездарма адным з пунктаў мерапрыемства стала фотавыстаўка «Любэцкія», на якой былі прадстаўлены фотакарткі з сямейных альбомаў. СТАР. 3



Фота Belta.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Ізраіль дамагаецца ад Украіны пераносу пасольства з Тэль-Авіва ў Іерусалім

Ізраіль хоча дабіцца ад украінскіх уладаў рашэння аб пераносе дыппрадстаўніцтва Украіны з Тэль-Авіва ў Іерусалім. Пра гэта паведаміў у інтэрв'ю ізраільскаму дзяржаўнаму радыё Кап міністр па справах Іерусаліма, пытаннях абароны навакольнага асяроддзя і культурнай спадчыны Ізраіля Зеэў Элькін.

«Мы ставілі перад сабой мэту паспрабаваць падштурхнуць новае кіраўніцтва Украіны пайсці па шляху невялікай колькасці дзяржаў, якія пачынаюць працэс пераносу свайго пасольства ў Іерусалім», — сказаў ён. Элькін, які суправаджае прэм'ер-міністра Ізраіля Біньяміна Нетаньяху падчас візіту ў Кіеў, адзначыў: у яўрэйскай дзяржаве разумеюць, што ўкраінцы «не змогуць проста так перанесці пасольства ў Іерусалім», як гэта зрабіў Вашынгтон 14 мая 2018 года паводле рашэння прэзідэнта Дональда Трампа. У Ізраілі разлічваюць, што Кіеў пойдзе па шляху Венгрыі і Чэхіі, якія адкрылі ў Іерусаліме культурныя цэнтры і гандлёвыя прадстаўніцтвы. «На сённяшні дзень гэта — максімум», на што можна спадзявацца ў пытанні пераносу ўкраінскай дыпмісіі, што выклікана пазіцыяй краін Еўрасаюза, у прыватнасці Германіі і Францыі, дадаў міністр.

Статус Іерусаліма — адна з ключавых праблем у палесціна-ізраільскім канфлікце. Ізраіль заняў усходнюю частку горада ў ходзе вайны 1967 года і настойвае, што Іерусалім з'яўляецца яго «адзінай і непадзельнай» сталіцай. Палесцінцы не пакідаюць надзей зрабіць Усходні Іерусалім сталіцай сваёй дзяржавы. Савет Бяспекі ААН адхіліў права Ізраіля на Усходні Іерусалім і заклікаў краіны ААН вывесці дыппрадстаўніцтвы з горада (рэзалюцыя 478 ад 20 жніўня 1980 года).

### МЗС Кітая назвала пратэсты ў Маскве ўмяшаннем Захаду ва ўнутраныя справы Расіі



Пазіцыю і дзеянні некаторых заходніх краін у дачыненні да антыўрадавых пратэстаў у Маскве варта лічыць умяшаннем ва ўнутраныя справы Расіі. Пра гэта заявіў афіцыйны прадстаўнік МЗС КНР Гэн Шуан.

«Мы падтрымліваем афіцыйную пазіцыю РФ. Гэта — тыповае ўмяшанне ва ўнутраную палітыку Расіі, якое сведчыць аб гегемоніі Захаду», — адзначыў ён, каментуючы сітуацыю.

Па словах Гэн Шуана, дзеянні расійскага ўрада па нармалізацыі сітуацыі ў Маскве цалкам законныя. «Клопат у гэтай сітуацыі выклікаюць некаторыя заходнія дзяржавы, якія выскокваюць ніадсюль, ніадкуль і робяць пры гэтым непрыстойныя захады», — падкрэсліў ён.

Нагадаем, што перад акцыямі 27 ліпеня і 3 жніўня 15 незарэгістраваных кандыдатаў у дэпутаты ў Масгардуму, якія былі арганізатарамі гэтых мерапрыемстваў, ігнаравалі папярджанні пракуратуры аб недапушчальнасці парушэння закона. У выніку 27 ліпеня за ўдзел у несанкцыянаванай акцыі была затрымана больш за тысячу чалавек. Следчы камітэт пачаў некалькі крымінальных спраў, у тым ліку па факце масавых беспарадкаў. За ўдзел у падобнай акцыі 3 жніўня было затрымана каля 600 чалавек.

### КАРАТКА

- **Удзельнікі марафону «24 РАЗАМ» прабеглі і праплылі больш за 12 тысяч гадзін у дапамогу дзецям.**
- У заказніку «Слаўгарадскі» з'явяцца веламаршруты і вышка па назіранні за птушкамі.
- **Семінары па новай сістэме аплаты працы медыкаў пройдуць у бальніцах і паліклініках.**
- У Ганцавіцкім раёне на сёмыя суткі знайшлі пенсіянера, які заблукаў у лесе.
- **Памёр вядомы беларускі трэнер па цяжкай атлетыцы Анатоль Лабачоў.**



- Да праслухоўвання дапушчана 38 удзельнікаў нацадбору дзіцячага «Еўрабачання-2019».
- **Кланіраваных катоў збіраюцца прадаваць у Кітаі.**

# «РАБІНЗОНЫ» ПАНЯВОЛІ

## Як не згубіцца ў лесе?

**Сезон ягад і грыбоў — у самым разгары. Спрыяе гэтаму даволі цёплае надвор'е і дажджы, якія ўсю першую палову жніўня шчодра паліваліі тэрыторыю нашай краіны. Але часам вандроўкі па лесе ў пошуках яго дароў могуць і зацягнуцца. Праходзіць гадзіна-другая ў пошуках выхаду з лесу, а наўкол — усё адно дрэвы ды хмызняк. І самае горшае, калі чалавек разумее, што ён ужо бачыў пэўнае дрэва і прасе хадзіў доўгі час па крузе...**

Зводкі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, што датычацца тых, хто заблукаў у лесе, часам проста шакіруюць. Так, на мінулым тыдні ў гушчары ў Расонскім раёне шукалі 89-гадовую бабулю. Яна пайшла ў грыбы раніцай і ўвечары дадому не вярнулася. Сваякі ўзнялі трывогу. На наступны дзень жанчыну знайшлі ў полі непадалёк ад лесу. Яна была жывая, але моцна знясіленая.



Таксама на мінулым тыдні 81-гадовы аматар грыбоў з Гомеля ледзьве не стаў міжвольным парушальнікам дзяржаўнай граніцы. Яго знайшлі літаральна за сотню метраў ад украінскай тэрыторыі. Як пасля паведамілі ў Дзяржпагранкамітэце, падчас вандроўкі па лесе ў дзядулі рэзка пагоршылася самаадчуванне. Ён нават не ўсведамляў, што прахадзіў у лесе цэлыя суткі. Небарака думаў, што знаходзіцца там усяго пару гадзін.

Жахлівы выпадак адбыўся ў канцы ліпеня ў Клічаўскім раёне Магілёўскай вобласці. Там ратавальнікі знайшлі 83-гадовага пенсіянера, які правёў на поплаве трое сутак без ежы, вады і сродкаў сувязі. Выбрацца адтуль ён бы не здолеў без дапамогі.

А вось у Мінскай вобласці дзве гісторыі скончыліся без залішніх прыгод. 11 жніўня мужчына ў Крупскім раёне пасля некалькіх гадзін бадзяння па лесе выйшаў на сігнал адмысловай прылады, якую прыгналі для паведамлення свайго. СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X

# ЗАКОН І ДАВЕР

### Выключыць памылкі на першым этапе

Аляксандр Лукашэнка паведаміў, што напярэдадні нарады даручыў даследаваць работу праваахоўных органаў і далажыць яму. Ён прыняў рашэнне рассакрэціць гэты даклад для грамадства.

Згодна з дакументам, шэраг недахопаў выяўлены ў арганізацыі дасудовага вядзення. Першае — нізкая якасць даследчых праверак і папярэдняга следства. Практыка пракурорскага нагляду сведчыць, што асноўнымі характэрнымі недахопамі ў рабоце органаў унутраных спраў з'яўляецца павярхоўнае даследаванне заяў і паведамленняў аб злачынствах, а таксама недастатковая дасведчанасць аператыўных супрацоўнікаў аб крымінальных з'явах на аб'ектах аператыўнага абслугоўвання. У шэрагу выпадкаў гэта прыводзіць да таго, што вінаватыя асобы, карыстаючыся сваёй беспакаранасцю, здзяйсняюць больш цяжкія злачынствы.

Па меркаванні Генеральнай пракуратуры, асноўная прычына недахопаў работы аператыўных падраздзяленняў — аслабленыя ведамасныя кантроль на ўзроўні гар-, райадзделаў упраўленняў унутраных спраў. З тых жа прычын у недастатковай ступені праводзіцца работа па супрацьдзеянні эканамічнай злачыннасці органамі фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю.

Галоўная «хвароба» аператыўнікаў — імкненне выканаць паказчыкі, адрапартаваць, але не папярэдзіць злачынства, не выключыць умовы, якія да яго прыводзяць.

Істотныя негатыўныя з'явы фіксуюцца Генеральнай пракуратурай таксама ў рабоце следчых падраздзяленняў. У тым ліку адзначаецца непрыняцце следчымі належных мер да збору доказаў. Нядбайныя адносіны следчых да афармлення працэсуальных дакументаў і крымінальных спраў, няякаснае правядзенне першасных, неадкладных следчых дзеянняў, няпоўная работа па кампенсацыі шкоды, учыненай злачынствам, прыводзяць да таго, што дзяржаўныя абвінаваўцы прад'яўляюць у судзе новае абвінавачанне або арганізоўваюць збор дадатковых доказаў. У перыяд з 2017 года да першага паўгоддзя 2019-га такое адбылося па 400 справах у адносінах да 683 асоб.

На факты парушэнняў следчых рэагуюць і суды. У 2018 годзе на адрас органаў следства накіравана 660 прыватных пастаноў, у першым паўгоддзі 2019 года — 372 прыватныя пастановы. Пры змяшэнні агульнай колькасці разгледжаных судамі спраў удзельная вага прыватных пастаноў істотна не расце.

### Недапушчальна «падганяць» справу

Другі важны недахоп — злоўжыванне службовымі асобамі праваахоўных органаў сваімі абавязкамі. «Тое, супраць чаго павінны праваахоўнікі змагацца, ім у віну ставіцца», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

Найбольш распаўсюджаныя парушэнні — ціск на ўдзельнікаў крымінальнага працэсу: падазроных, абвінавачаных, адвакатаў, а таксама суддзяў; фальсіфікацыя доказаў; умышаннe ў ход разбіральніцтва па крымінальных справах і матэрыялах праверак.

Указаныя факты абумоўлены як карыслівымі матывамі — подкуп з мэтай прыняцця канкрэтнага рашэння, жаданне атрымаць асабістую выгаду, так і імкненнем службовых асоб забяспечыць выкананне даведзеных кіраўніцтвам паказчыкаў аператыўна-службовай дзейнасці і статыстычнай справаздачнасці. «Дзікунства!» — коратка пракаментаваў Аляксандр Лукашэнка.

Усяго за апошнія два з паловай гады судамі краіны былі асуджаныя 24 былыя супрацоўнікі аператыўных і следчых падраздзяленняў за здзяйсненне супрацьпраўных дзеянняў пры выяўленні злачынстваў і расследаванні крымінальных спраў. «Усяго нічога, але гэта толькі пачатак, — папярэдзіў Прэзідэнт. — Пасля сённяшняй гістарычнай нарады па ўсіх гэтых пытаннях ціск будзе ўзмоцнены...»

Аляксандр Лукашэнка паўтарыў: для людзей, у адносінах да якіх праваахоўнікі дапусцілі парушэнні, трагедыя ніколі не застанецца ў мінулым.

Прэзідэнт досыць рэзка выказаўся аб фактах прызмернага прымянення ў адносінах да грамадзян сілы і спецсродкаў. «Выкарыстоўваюць спецпадраздзяленні, у прыватнасці «Алмаз». Няслявяць хлопцаў толькі. Трэба звярнуць увагу на гэтыя спецслужбы, іх трэба ўзяць пад кантроль, — загадаў ён. — Гэта не справа: прымушаюць двухметровых хлопцаў вагой 150 кілаграмаў ва ўсім абмундзіраванні, з дубінкамі, боепрыпасамі і зброяй урывацца ў дамы грамадзян і здзекавацца з іх!»

Яшчэ адно парушэнне датычыцца абгрунтаванасці завядзення крымінальных спраў і практыкі абрання меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту. Праверка вызначыла таксама недастатковасць дзейснага пракурорскага нагляду. Крымінальныя справы часта накіроўваюцца ў суд без неабходных аналізу і праверкі.

Ёсць пажаданні і на адрас суддзяў. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што нягодная з'яўляецца практыка павелічэння аб'ёму доказаў, замест імкнення да паўнаты.

Прэзідэнт падкрэсліў недапушчальнасць захавання «палача-на-галачных» падыходаў да ацэнкі дзейнасці органаў унутраных спраў і следчых падраздзяленняў. «Гарачым жалезам варта гэта выпаліць. Словамі не дапаможам. Трэба гэта зрабіць на падставе заканадаўчых актаў, бо яны па-ранейшаму будуць ставіць палачкі-галачкі і выхваляцца, якія яны вялікія, колькі расследавалі крымінальных спраў», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Паводле яго слоў, асноўнай прычынай, якая спрыяе прыняццю службовымі асобамі праваахоўных органаў неправамерных рашэнняў у крымінальным працэсе, з'яўляецца неэфектыўнасць сістэмы ацэнкі аператыўна-службовай дзейнасці, і, адпаведна, неэфектыўны кантроль унутры ведамстваў.

«Тэндэнцыя работы праваахоўных органаў на статыстыку спрыяе канцэнтрацыі супрацоўнікаў не на забеспячэнні законнасці, абароне правоў і інтарэсаў грамадзян, рэагаванні на парушэнне законаў, а на штучнай дэманстрацыі сваёй работы шляхам дасягнення планавых паказчыкаў і статыстыкі, — падкрэсліў беларускі лідар. — Мы, вядома ж, будзем звяртаць увагу на статыстыку, але трэба разбірацца, што ляжыць у яе аснове — штучныя паказчыкі ці гэта сапраўды паказчыкі рэальнай работы і праваахоўнай сістэмы».

### Не стваraць умовы для абгавораў

Асобную ўвагу Аляксандр Лукашэнка звярнуў на наяўнасць дастаткова доказнай базы пры расследаванні карупцыйных злачынстваў. На праблемы ў гэтым кірунку паказвае і Вярхоўны суд. Як паказвае практыка, часам абвінавачанні будуюцца на чыіх-небудзь блытаных успамінах аб даўніх падзеях, пры гэтым канкрэтны факт атрымання хабару адсутнічае. Такія падыходы да доказу вінаты патэнцыйнага хабараатрымальніка істотна падвышаюць рызыку яго абгавору, у тым ліку канкурэнтамі, заўважыў Прэзідэнт.

Пры гэтым ён папярэдзіў, што паслабляць барацьбу супраць хабарніцтва нельга і ніякага змякчэння пакарання для карупцыянераў быць не павінна, дадаўшы: «Але ні ў якім разе мы не павінны пакараць чалавека, які не вінаваты. Лепш не расследуйце гэтыя крымінальныя справы, калі вы не бачыце жалезабетонных доказаў».

Падводзячы вынікі нарады, Аляксандр Лукашэнка арыентаваў праваахоўныя органы на больш яскравую работу ў сферы абароны законных правоў грамадзян. «Вы не толькі павінны быць чысцілішчам, але і ўмець своечасова праінфармаваць Прэзідэнта з мэтай абароны людзей», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Справядлівае павінна быць стаўленне да людзей! Бо самі можам апынуцца на месцы тых людзей, якіх вы часам ціснеце, і незаконна. Высновы сказанага мною: праваахоўныя органы павінны працаваць не проста эфектыўна, а якасна, разумна. І ў аснову трэба пакласці не толькі закон (у ім не прапішаш усё, што адбываецца ў жыцці) — пакладзіце ў аснову справядлівасць. Не душыце людзей залішне. Але, з іншага боку, не даруйце нічога падонкам, нягоднікам і бандытам. Бо інакш пра стабільнасць у нашым грамадстве размовы быць не можа», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

---

Блізкая ўлада

## Замест слоў — справы

**Памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гродзенскай вобласці Іван Лаўрыновіч правёў прамую лінію ў ІУёўскім райвыканкаме.**

Фота БелТА.

Як перадаў карэспандэнт БелТА, на прамую лінію паступіла звыш дзясятка пытанняў, большасць з якіх датычылася добраўпарадкавання, жыллёвага будаўніцтва, функцыянавання жыллёва-камунальнай гаспадаркі і стану дарог. Па шэрагу пытанняў дадзены канкрэтныя адказы, вырашэнні праблем па іншых будуць узятыя на кантроль.

«Улада на месцы павінна рабіць усё, каб згладзіць нязручнасці, стварыць камфортныя ўмовы для кожнага. Пры гэтым адказваць на звароты грамадзян трэба не гучнымі абяцаннямі, а канкрэтнымі справамі», — падкрэсліў Іван Лаўрыновіч. У большасці раёнаў Гродзенскай вобласці, як паказвае аналіз зваротаў на прамыя лініі, на пытанні рэагуюць належным чынам, імкнуцца ў кароткія тэрміны вырашыць праблему.

Зрэшты, варта ўлічваць, што там, дзе неабходныя сур'ёзныя фінансавыя выдаткі, напрыклад, у будаўніцтве дарог або пракладцы камунікацый, імгненнае вырашэнне сітуацыі немагчымае. Адна пустых абяцанняў быць не павінна. Усё запланаванае неабходна рабіць у тэрмін, адзначыў Іван Лаўрыновіч.

Падчас прамой лініі, у прыватнасці, паступіў зварот з боку шматдзетнай маці з пасёлка Юраціжкі. Сям'я будзе дом, жанчына цікавілася, ці мае яна права на субсідыі і дапамогу ў будаўніцтве. Яе запрасілі ў райвыканкам, спецыялісты акажуць неабходную прававую падтрымку.

Адразу некалькі зваротаў датычыліся будаўніцтва крамы ў крокавай даступнасці ў раёне вуліцы Карла Маркса райцэнтра. Часцей за ўсё такія аб'екты ўзводзіць прыватны бізнес. У наступным годзе, як чакаецца, праблема будзе знятая: адна з кампаній выкупіла на аўкцыёне ўчастак пад будаўніцтва менавіта харчовай крамы.

Канкрэтны адказ дадзены і на зварот жыхара вёскі Заберазь побач з трасай М6 Мінск—Гродна. Пасля рэканструкцыі галоўнай артэрыі рэгіёна было ліквідавана скрыжаванне, перасякаць дарогу стала небяспечна, людзям даводзіцца ехаць у абход за некалькі кіламетраў.

«Цяпер дадатковага пераглядаюцца перасячэнні другарадных дарог з трасай у адной плоскасці: чатыры з іх — самыя небяспечныя — будуць зачыненыя. На жаль, на некаторых з іх адбыліся аварыі са смяротным зыходам», — адзначыў Іван Лаўрыновіч. Ён падкрэсліў, што ў прыярытэце пры арганізацыі руху застаецца бяспека кіроўцаў і пешаходаў, часам для гэтага даводзіцца ахвяраваць зручнасцю.

---

# «Патрабавальнасць будзе толькі ўзрастаць»

**Па словах прэс-сакратара Прэзідэнта Наталлі ЭЙСМАНТ, на нарадзе адбылася няпростая, адкрытая, а часам і жорсткая размова. «Тыя, хто паспяшаўся ўбачыць тут нейкія будучыя паслабленні, а тым больш нейкую піяр-кампанію, проста недаацэньваюць сітуацыю і не ведаюць нашага Прэзідэнта. Патрабавальнасць з сённяшняга дня будзе толькі ўзрастаць, прычым патрабавальнасць па ўсіх франтах», — падкрэсліла яна ў размове з журналістамі.**



Фота БелТА.

Прэс-сакратар Прэзідэнта звярнула ўвагу, што да бандытызму, карупцыі і іншых парушэнняў закона стаўленне з боку дзяржавы будзе ранейшае і нават яшчэ больш жорсткае. «Гэта значыць паслабленняў не будзе, хто б што ні ўбачыў. Тым, каму месца ў турме, павінны быць і будуць у турме. Гэта адназначна», — сказала Наталля Эйсмант.

У той жа час кіраўнік дзяржавы запатрабаваў, каб пры расследаванні крымінальных спраў не пакутавалі невінаватыя людзі. «Справядлівасць тут сапраўды ключавое слова. На гэта Прэзідэнт звярнуў увагу не раз. У гэтым плане будзе шматкроць узмацняцца кантроль за якасцю работы праваахоўных органаў. А гэта і ёсць тая самая справядлівасць», — адзначыла Наталля Эйсмант.

Яна асабліва падкрэсліла: Прэзідэнт рассакрэціў, напэўна, адзін з самых закрытых дакументаў, які паступіў да яго пасля дбайнай прапрацоўкі адпаведных структур. «Гэта тое, што, кажучы простай мовай, накапалі самі ж праваахоўнікі, — звярнула ўвагу прэс-сакратар. — Прэзідэнт не спыніўся на некіх канкрэтных фактах, нічога не канкрэтызаваў, каб не авесці размову ў абмеркаванне нейкіх прыватных прыкладаў, выпадкаў. Галоўнай мэтай было канкрэтызаваць і назваць менавіта праблемы, недахопы і запатрабаваць ад прысутных тлумачэнні па гэтых праблемах і недахопах».

Па словах Наталлі Эйсмант, падчас закрытай часткі нарады ў кожнага ўдзельніка была магчымасць выказацца і прадставіць сваю пазіцыю. Сваю ацэнку сітуацыі, напрыклад, далі кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта, дзяржсакратар Савета бяспекі. Старшыня Вярхоўнага суда падрабязна спыніўся на рабоце Следчага камітэта, пазначыўшы недахопы і выказаўшы шэраг прапаноў. «Асобна Прэзідэнт звярнуўся да губернатараў, бо гэта яго першыя прадстаўнікі ў рэгіёнах. І тут жорсткае патрабаванне кіраўніка дзяржавы, што яны павінны бачыць сітуацыю. Яны павінны бачыць перагібы і своечасова інфармаваць пра іх Прэзідэнта. У Беларусі нарадзілася ўлада, яна павінна і будзе бачыць інтарэсы народа. Гэта ключавы пасыл кіраўніка дзяржавы ўдзельнікам нарады», — расказала прэс-сакратар.

Гаворачы аб выніках нарады, Наталля Эйсмант адзначыла, што для праваахоўнай сістэмы Беларусі сёння быў сапраўды гістарычны момант, сур'ёзны паварот у рабоце. І, па словах прэс-сакратара, ні ў якім разе не гучныя словы. «Вы выдатнаведаеце стаўленне нашага Прэзідэнта да карупцыі, да сканмічных злачынстваў, ды і наогул да парушэнняў закона ў любой форме. Таму з сённяшняга дня патрабавальнасць будзе ўзрастаць, як будзе ўзрастаць і ціск. Да бандытаў будуць ставіцца выключна як да бандытаў, а тыя заўвагі і недахопы, якія былі выяўлены і агучаны сёння, будуць выпальваць гарачым жалезам», — падкрэсліла прэс-сакратар кіраўніка дзяржавы.

Завяршаючы нараду, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў цэлым у краіне выбудаваная нядрэнная сістэма работы праваахоўных органаў, аднак ад кіраўнікоў ён патрабаваў не заплюшчваць вочы на ??існуючыя негатыўныя праявы, а ліквідаваць усе вузкія месцы і, самае галоўнае, за кожным фактам бачыць лёс чалавека.

### ❍ У тэму

Па словах **дзяржаўнага сакратара Савета бяспекі Станіслава ЗАСЯ**, галоўнае патрабаванне Прэзідэнта да праваахоўнікаў заключаецца ў тым, каб пры расследаванні крымінальных спраў не пацярпеў ні адзін невінаваты чалавек, і ў той жа час была забяспечана няўхільнасць пакарання. «Гэта непазбежная ўмова для таго, каб краіна жыла стабільна, у прававым полі, і панаваў закон», — падкрэсліў дзяржсакратар.

Пасля нарады на прэзідэнцкім узроўні дзейнасць сілавікоў будзе падрабязна прааналізавана ў саміх праваахоўных органах, іх рэгіянальных падраздзяленнях, а таксама на міжведамасных сустрэчах. «Трэба мяняць некаторыя падыходы ў рабоце, стыль і, вядома, павышаць яе якасць», — сказаў Станіслаў Зась.

У прыватнасці, адзначыў ён, неабходна дэталёва разабрацца з крытэрыямі ацэнкі дзейнасці праваахоўнікаў. Напрыклад, пры расследаванні нарказлачынстваў некаторыя супрацоўнікі імкнуцца любой цаной паказаць вынік, і пачынаюцца перагібы. Пры гэтым галоўная задача — пошук і спыненне буйных каналаў збыту наркотыкаў — не выкашаецца.

«Важныя не толькі крытэрыі (яны існуюць у любой дзейнасці), але і тое, як гэтыя паказчыкі забяспечваюцца. Тут важны ведамасны кантроль за дзейнасцю супрацоўнікаў праваахоўных органаў — ад самага верху, ад міністра да кіраўнікоў падраздзяленняў», — звярнуў увагу дзяржаўны сакратар Савета бяспекі.

**Старшыня Вярхоўнага суда Валянцін СУКАЛА** лічыць, што некаторыя недахопы ў рабоце Следчага камітэта тлумачацца тым, што на нейкай стадыі ўнутрыведамасны і міжведамасны працэсуальны кантроль быў аслаблены. «Быў парушаны галоўны канстытуцыйны прынцып крымінальнага правасуддзя — прэзумпцыя невінаватасці», — сказаў Валянцін Сукала журналістам.

Паводле яго слоў, часам органы папярэдняга расследавання надаюць аслабляе значэнне першасным аператыўным даным, атрыманым у пачатку расследавання, але ў далейшым гэтыя доказы не пацвярджаюцца. «Такая перааценка першасных доказаў, загадзя аб'яўленне кагосьці вінаватым, у тым ліку ў сродках масавай інфармацыі, выкарыстанне непразсуальных, непрадуманых бытавых выразаў, як правіла, прыводзяць да таго, што скажаецца ўяўленне аб вінаватасці», — адзначыў старшыня Вярхоўнага суда.

Акрамя таго, дадаў ён, на стадыі папярэдняга расследавання шмат следчых забываюць яшчэ адзін важны прынцып крымінальнага працэсу — ацэнка ўсіх сумневаў на карысць абвінавачанага і абароны. Валянцін Сукала падкрэсліў, што Генеральная пракуратура павінна ўважліва вывучаць усе абвінавачанні і не накіроўваць справы са слабай доказнай базай у суд, аднак і тут здараюцца недапрацоўкі.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

---

Размова па сутнасці

# У ІМЯ ДАБРАБЫТУ, МІРУ І БЯСПЕКІ

**Шостая сесія Палаты прадстаўнікоў завяршыла сваю работу ў канцы чэрвеня, сёмая пачнецца ў кастрычніку. Але канікул у парламентарыяў не бывае: яны актыўна дапрацоўваюць да разгляду праекты законаў, займаюцца грамадска-палітычнай, міжнародным дзейнасцю, працуюць у акругах.**

**«Звязда» сустрэлася ў Палаце прадстаўнікоў з членамі Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі, дэпутаты расказалі пра набыты вопыт і самыя значныя, на іх погляд, законапраекты, за падрыхтоўку якіх адказавала камісія.**

### Асноўныя кірункі

**Валянціна РАЖАНЦАЎ:** У Пасланні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь вызначаны асноўныя прыярытэты ўпэўненага курса нашай краіны: дабрабыт народа, міралюбівая знешняя палітыка і нацыянальная бяспека. Уласна кажучы, на гэта і накіравана работа парламента.

Мы разгледзелі шмат законапраектаў, але важная не лічба, а змест. Дэпутаты літаральна жылі гэтымі праектамі законаў, карпатліва над імі працавалі.

**Адам КАВАЛЬКА:** Хачу падкрэсліць, што некаторыя з іх. Першы датычыцца замацавання ў Крымінальна-працэсуальным кодэксе права сведкі запрашаць адваката для атрымання юрыдычнай дапамогі пры працэсуальных дзеяннях.

Гэтае права грунтуецца на артыкуле 62 Канстытуцыі, у адпаведнасці з якім кожны мае права на юрыдычную дапамогу, у тым ліку права карыстацца ў любы момант дапамогай адвакатаў. Права ўніверсальнае і не можа быць абмежавана. Разам з тым у нашым заканадаўстве да нядаўняга часу адсутнічалі прававыя нормы, якія рэгламентавалі ўдзел адваката сведкі ў крымінальным працэсе. У рабоце над праектам закона актыўна ўдзельнічалі Генеральная пракуратура, Следчы камітэт, Міністэрства ўнутраных спраў і іншыя. Пасля шматлікіх дыскусій заканадаўчы акт быў прыняты і 31 студзеня 2018 года ўступіў у сілу. Практыка паказала: сведкі карыстаюцца паслугамі адваката, юрысты адзначаюць прагрэсіўнасць прынятых змяненняў.

Вельмі насычаная была работа над законапраектам «Аб змяненні законаў» (па пытаннях паляўнічай гаспадаркі і паляявання). Дакумент накіраваны на лібералізацыю прававадносін у гэтай сферы і рэалізацыю Указа кіраўніка нашай дзяржавы № 112. Праектам прапанавалася змякчыць адміністрацыйныя пакаранні за нязначныя парушэнні, дапушчаныя паляўнічым або карыстальнікам паляўнічых угоддзяў пры правядзенні паляявання ці паляўніча-гаспадарчай дзейнасці. Гэта дазволіць у далейшым прымяняць меры маральнага ўздзеяння, а не штрафныя санкцыі.

### Папярэдзіць беспарадкі і вяртанне «карычневай чумы»



**Валерый САЎКО:** Я працаваў з законапраектам «Аб змяненні Закона «Аб масавых мерапрыемствах». Асноўная яго навацыя — увядзенне паведамляльнага парадку правядзення масавых мерапрыемстваў у прызначаных для гэтага месцах. Акрамя таго, законам прадугледжаны шэраг мер, якія накіраваны на забеспячэнне грамадскага парадку і бяспекі.

Мне таксама давялося ўзначальваць рабочую групу па падрыхтоўцы змяненняў у Закон «Аб супрацьдзеянні экстрэмізму». У чэрвені ён быў прыняты ў другім чытанні.

Уводзіцца крымінальная адказнасць за наўмысную публічную рэабілітацыю нацызму нароўні з распальваннем расавай або іншай сацыяльнай варожасці і ўзмацняецца адміністрацыйная адказнасць за проціпраўныя дзеянні з нацысцкай сімволікай. «Які ў нашай краіне можа быць нацызм?» — такое пытанне ўзнікла ў мяне, напэўна, як і ў большасці беларусаў. Аднак прадстаўнікі Міністэрства ўнутраных спраў агучылі лічбы і паказалі фотаздымкі, якія шакіруюць. За апошнія тры гады ў 15 разоў выраслa колькасць выпадкаў прыцягнення да адміністрацыйнай адказнасці за распаўсюджванне нацысцкай сімволікі. Мы не павінны здрадзеяць памяці і забыць, колькі гора і пакут ад фашызму перанёс наш народ.

**Валянціна РАЖАНЦАЎ:** Яшчэ адзін аспект работы над законапраектам — комплексны і шырокі падыход да вырашэння праблемы. Не толькі забарона, увядзенне крымінальнай або адміністрацыйнай адказнасці, але неабходнасць выхаваўчай работы ў сям'і, у дзіцячых садках, школах, выхаванне любові да сваёй малой радзімы, — уласна, з гэтага і пачынаецца патрыятызм.

### Пра адказнасць

**«Звязда»:** Кампетэнцыя Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі досыць шырокая, вы рыхтавалі і законапраекты, якія датычаюцца лібералізацыі адміністрацыйнай адказнасці.



**Васіль БАРАНІК:** Так, у прыватнасці — у сферы малога і сярэдняга бізнесу, якому вельмі важна забяспечыць далейшае развіццё і стварыць спрыяльныя ўмовы. Заканадаўчыя акты распрацаваны ў адпаведнасці з пастаўленымі Дэкрэта Прэзідэнта № 7, зменшаны штрафы, выключаны шэраг не запатрабаваных практыкай, не адпавядаючых эканамічным рэаліям фармальных складаў адміністрацыйных правапарушэнняў. Праект закона, які я ў свой час вёў, абмежаваў злоўжыванні ў сферы кантролю. Закон уступіў у сілу і ціпер за праверкі, якія праведзены з грубымі парушэннямі заканадаўства, рэвізорам могуць аштрафаваць на суму ад 20 да 100 базавых велічынь.

### Абараніць дзяцей

**«Звязда»:** Была яшчэ адна важная тэма ў рабоце Камісіі: абарона дзяцей ад інфармацыі, якая шкодзіць іх здароўю і развіццю.

**Валянціна РАЖАНЦАЎ:** Закон, які датычыцца пытанняў абароны дзяцей ад інфармацыі, якая шкодзіць іх здароўю і развіццю, быў падрыхтаваны Камісіяй Палаты прадстаўнікоў папярэдняга склікання і ўступіў у сілу 1 лістапада 2017 года.

Абагульніўшы ўласны вопыт работы ў выбарчых акругах, члены камісіі прыйшлі да высновы, што неабходна не толькі вывучаць прававымяральную практыку, але і звярнуць асаблівую ўвагу на тлумачэнне сэнсу і зместу новых нормаў у заканадаўстве, якія маюць шырокі грамадскі рэзананс.

З гэтай мэтай 1 чэрвеня 2017 года ў горадзе Астравец Гродзенскай вобласці адбылося выязное пасяджэнне Пастаяннай камісіі, а таксама прайшлі сустрэчы ў працоўных калектывах, з жыхарамі рэгіёна, падчас якіх удзельнікі змаглі абмяняцца меркаваннямі і атрымаць адказы на пытанні. Такая форма работы, на думку Камісіі, мела станоўчы эфект. Нам разам са спецыялістамі варта больш шырока весці растлумачальную работу па змесце новых заканадаўчых нормаў, механізме іх рэалізацыі, актыўна выкарыстоўваць гэты найважнейшы інструмент у канструктыўным дыялогу з людзьмі.

Працягваючы сістэмную работу, адным з прыярытэтных кірункаў якой з'яўляецца абарона і рэалізацыя правоў і законных інтарэсаў дзіцяці, сёлета ў лютым правялі круглы стол, на якім былі абмеркаваны першыя вынікі рэалізацыі прынятага заканадаўчага рашэння.

У гутарцы акрамя парламентарыяў удзельнічалі прадстаўнікі міністэрстваў адукацыі, інфармацыі, унутраных спраў, пракуратуры, ЮНІСЕФ, Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў, сотавых аператараў і іншых. Што мы, дарослыя, можам і павінны зрабіць яшчэ, каб дзяцінства не было азмрочана нечымі неправамернымі дзеяннямі, не былі скажоныя фарміраванне маральных прынцыпаў, пабудова прыярытэтаў і каштоўнасцяў падлеткаў? На гэтых і іншых пытаннях была засяроджана ўвага пры абмеркаванні вынікаў рэалізацыі прынятага заканадаўчага рашэння, ацэнцы яго эфектыўнасці, зразумеласці і даступнасці для выканання.

Мы глыбей падышлі да гэтай тэмы, калі працавалі над папраўкамі ў Закон «Аб сродках масавай інфармацыі». У спіс забароненай да распаўсюджання, напрыклад, была ўключана інфармацыя, накіраваная на прапаганду суіцыдальных дзеянняў. Разам з тым необходна павышаць узровень інфармацыйнай культуры грамадства, фарміраваць пазіцыю непрымання дэструктыўнай інфармацыі. Над гэтым яшчэ належыць нямала папрацаваць.

**«Звязда»:** І тут мы зноў кажам пра выхаванне...

**Валянціна РАЖАНЦАЎ:** Размова таксама пра самарэгуляцыю інфармацыйнай прасторы. Як дабіцца таго, каб людзям сталі нецікавыя сайты з «брудным» зместам, каб яны адрозніваліся нейтральную інфармацыю ад небяспечнай? Кожны чалавек павінен разумець сваю адказнасць перад іншымі.

За перыяд дзейнасці шостага склікання на базе абласных газет «Гомельская праўда» і «Гродзенская праўда» адбыліся пашыраныя выязныя пасяджэнні Пастаяннай камісіі і Камісіі Парламенцкага сходу па інфармацыйнай палітыцы, на якіх разглядаліся асноўныя тэндэнцыі і перспектывы развіцця медыйнай сферы, абмяркоўваліся пытанні супрацоўніцтва ў рамках Саюзнай дзяржавы.

### Міжнародныя адносіны

**«Звязда»:** Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў актыўна ўдзельнічаюць у міжнародных парламенцкіх мерапрыемствах...

**Адам КАВАЛЬКА:** На маю думку, аўтарытэт Беларусі ўзмацніўся. Удзел у такіх мерапрыемствах дае плён, і гэту дзейнасць трэба выкарыстоўваць для наладжвання супрацоўніцтва ў розных кірунках.

**Валянціна РАЖАНЦАЎ:** Беларусь трэба ўбачыць і адчуць, бо часам распаўсюджваныя стэрэатыпы перашкаджаюць успрымаць нашу краіну непрадузята. І самы лепшы сродак — жывыя зносіны, дыялог. Прадстаўнікі нашай Камісіі рэгулярна ўдзельнічаюць у канферэнцыях і іншых мерапрыемствах пад эгідай ААН, АБСЕ, Савета Еўропы, у раўндах дыялогу па правах чалавека з Еўрапейскім саюзам і ЗША. Праводзяцца сустрэчы з прадстаўнікамі міжнародных арганізацый, замежныміі дыпламатамі.

### Палітычная сталасць

**«Звязда»:** Якое ўражанне ў дэпутатаў ад работы непасрэдна ў выбарчых акругах? З якімі пытаннямі прыходзяць людзі?

**Валерый САЎКО:** У асноўным з жыццёвымі: дзесьці трэба навесці парадак, уладкаваць дваровыя тэрыторыі, звяртаюцца наконт рамонту і будаўніцтва дарог. Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя ўлады ведаюць праблемы і вырашаюць іх, і трэба разумець, што ісnуе пэўная чарговасць. Адначасова ўсё зрабіць немагчыма, да таго ж у асобных выпадках патрабуюцца немалыя фінансавыя ўкладанні.

Трэба адзначыць, што людзі выказваюць цікавасць да дзеючых законаў і ўносяць свае прапановы. На маю думку, і палітычная, і прававая адукаванасць нашага насельніцтва расце.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ і БелТА.**

На слыху

# «Наш хакей пойдзе ўверх»,

## упэўнены новы галоўны трэнер нацыянальнай зборнай Міхаіл Захараў

**Міхаіл Міхайлавіч быў абраны на гэты пост па выніках пасяджэння трэнерскага савета Беларускай федэрацыі хакея. Дарэчы, яго кандыдатура была адзіная, яе адногалосна падтрымалі члены трэнерскага савета і ўхвалілі выканкам.**

Ігар Ільін

**Спартыўны дырэктар федэрацыі хакея Уладзімір БЕРАЖКОЎ** адзначыў, што галоўныя задачы, якія будуць стаяць перад новым настаўнікам каманды, — выступленне на чэмпіянаце свету — 2020 і Алімпійская кваліфікацыя, якая пройдзе восенню 2020 года. Задачы сур'ёзныя і няпростыя.

Кантракт з трэнерам «Юнацтва» Міхаілам Захаравым заключаны на два гады. *«Работы сапраўды шмат. Чэмпіянат свету ў 2021 годзе будзе праходзіць у Мінску,* — адзначае Міхаіл Міхайлавіч. — *Зараз наш хакей забуксаваў, няма хакеістаў узроўню Калюжнага, Грабоўскага, Кальцова, Касцыцыных. Але ж будзем працаваць і ісці далей. Рукі ніхто не апускае, задачы ёсць, і мы можам іх выканаць разам з трэнерамі і федэрацыяй. Калі станем адным цэлым — гэтыя задачы будуць па сілах. У нас ужо ёсць напрацоўкі, усе трэнеры гатовыя дапамагчы».*

Трэнерскі штаб нацыянальнай каманды пакуль не абмяркоўваўся і будзе вызначаны пазней. Міхаіл Захараў адзначыў, што ўсе рашэнні будуць прымацца разам з трэнерскім саветам. *«Не будзе такога, што «я хачу гэтага, а ад гэтага адмовіўся». Мы павінны разам абмеркаваць гэтае пытанне, але ў зборнай павінны быць толькі найлепшыя трэнеры»,* — падкрэсліў настаўнік.

Таксама ён адзначыў, што беларускі хакей павінен пайсці наперад, за кошт работы дзіцячых школ. Мэта, каб свае дзіцячыя школы падцягвалі не толькі «Дынама» і «Юнацтва», але і «Гомель», і «Нёман», а пазней гулялі сваімі выхаванцамі. *«Усе вобласці павінны выхоўваць гульцоў для зборнай. Сёння дзве з іх наогул не прадстаўлены ў экстралізе «А»: Віцебская і Брэсцкая. Ні адной каманды, гэта дрэнна»,* — сказаў Захараў. Таму настаўнік не выключае, што ў зборнай Беларусі з'явяцца натуралізаваныя замежнікі, ён не супраць такой практыкі. Пра тое, ці будзе мінскае «Дынама» базавым клубам для зборнай, Міхаіл Захараў пакуль сказаць не змог, але дакладна адзначыў, што ён будзе сумяшчаць пасады галоўнага трэнера ў «Юнацтве» і зборнай. *«Лічу, што трэнер не павінен працаваць толькі са зборнай. Калі ты працуеш у такім рэжыме, панікуе ККД, з'яўляецца расслабленасць — гэта няправільна»,* — сказаў ён.

Нагадаем, 57-гадовы Міхаіл Захараў з 1998 года — практычна нязменны галоўны трэнер ХК «Юнацтва-Мінск» (да 2003 года — СДЮШАР «Юнацтва»). Выключэннем стаў сезон 1999/2000, калі настаўнік узначальваў ХК «Мінск». Усе найбольш прыкметныя поспехі «чырвона-сініх» (восем тытулаў чэмпіёна Беларусі, шэсць Кубкаў Беларусі (цяпер Кубак Салея), тры Кантынентальныя кубкі) здабытыя менавіта пад яго кіраўніцтвам. У нацыянальнай зборнай Беларусі Захараў дэбютаваў у якасці асістэнта галоўнага трэнера ў сезоне 1997/98, выступаючы ў гэтай ролі аж да чэмпіянату свету 2003 года. Быў у ролі галоўнага трэнера юніёрскай (U18) зборнай — з 2000 да 2003 года. На юнацкім чэмпіянаце свету 2002 года беларуская зборная пад кіраўніцтвам Захарава дабілася найвышэйшага дасягнення, паўтарыла якое толькі на мінулым ЮЧС-2019, — 5-е выніковае месца.

У якасці галоўнага трэнера зборнай нашай краіны Міхаіл Міхайлавіч працаваў у сезонах 2003/04 і 2004/05 (пакінуў пасаду пасля няўдалага выступлення зборнай на турніры Алімпійскай кваліфікацыі ў Рызе), а таксама ў ходзе Алімпійскіх гульняў — 2010 у Ванкуверы. На чэмпіянаце свету 2010 года ў дывізіёне 1 займаў пасаду галоўнага трэнера зборнай Украіны.

Тройны прызнавальны найлепшым трэнерам Беларусі.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

Молада-зелена!

# МІШКА ЕСЦІ ЗАХАЦЕЎ

## Малады мядзведзь «дапамог» сабраць ураджай груш у Расонскім раёне

**Паведамленне пра гэта паступіла ў мясцовы РАУС ад дачніцы з вёскі Кульнева. Пажылая жанчына расказала, што хтосьці ў ноч з 17 на 18 жніўня на яе ўчастку пашкодзіў ігрушу. Зламыснік не толькі абламаў галіны, але і пакінуў побач свае сляды.**

А ўжо вечарам яна на свае вочы ўбачыла, хто «дапамог» ёй сабраць ураджай. Пры гэтым малады мядзведзь ані не сароміўся ласавацца грушамі пры гаспадыні ўчастка. Жанчына спудзіла звера крыкамі і паведаміла пра тое, што здарылася, праваахоўнікам. Яны, а таксама егеры паляўнічай гаспадаркі «Чырвоны бор» абследавалі тэрыторыю, але мядзведзя так і не знайшлі.

Як расказалі ў Сакалішчанскім сельскім савеце, нечаканага госця бачылі і вечарам 19 жніўня. Ён прыйшоў у вёску з боку лесу, убачыў мясцовую жыхарку, стаў на заднія лапы і пайшоў назад.

**Рыгор ЯНУТА, вядучы навуковы супрацоўнік сектара заведнай справы навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па біярэсурсах** адзначыў, што для мядзведзяў яблыкі, ігрушы і іншыя фрукты і ягады, што растуць у садах у населеных пунктах і былых месцах пасялення чалавека, — лёгкая здабыча, на атрыманне якой не трэба траціць шмат сіл. А калі на полі побач з лесам сеялі, а потым сабралі збожжавыя, то гэтым людзі пазбавілі жывёлу крыніцы харчу, таму яна і шукае яго ў іншых месцах. Такім спосабам можа здабываць ежу і малады мядзведзь.

— Пры сустрэчы з любой дзікай жывёлай — ці гэта мядзведзь, ці гэта здзічэлы сабака — нельга ўцякаць ад яе, дэманстраваць агрэсію. Наадварот, жывёла павінна бачыць, што ёй нічога не пагражае, — кажа вучоны. — Калі вы ўбачылі мядзведзя, неабходна павольна адыходзіць, стараючыся не паказваць свайго хвалявання. У лесе ад дарослага мядзведзя можна схавацца на дрэве — толькі медзведзяняты могуць добра лазіць па ім. Збіраючыся ў лес, адзявайце прыкметную вопратку. Гэта можа дапамагчы пазбегнуць нечаканай сустрэчы з драпежнікам, які будзе папярэджаны аб вашай прысутнасці.

— Гэта малады, яшчэ неразумны мядзведзь, таму і выбраў такі спосаб пракармлення, — тлумачыць выпадак у Кульневе **егер Аляксандр САМОЙЛЕНКА.** — Раней у нас гэтыя звяры таксама заходзілі ў закінутыя населеныя пункты, але у жылую вёску — упершыню.

Паколькі мядзведзь — жывёла, занесеная ў Чырвоную кнігу, і агрэсіўнымі метадамі (з удзеламі зброі) яго адганяць нельга, калі мішка наведаецца зноў, магчыма, будуць выкарыстаны шумавыя сродкі. Пакуль план дзеянняў абмяркоўваецца.

**Мінпрыроды сумесна з навукоўцамі і грамадскасцю распрацавалі рэкамендацыі для насельніцтва па паводзінах пры сустрэчы з дзікімі жывёламі. Вось датычныя менавіта сустрэчы з мядзведзем.**

✓ Калі мядзведзь пры чалавеку ўстаў на заднія лапы і, знаходзячыся на некаторым аддаленні, робіць палохаючыя выпады і кідкі ў ваш бок, узбуджана праходжваецца, паварочваецца бокам (каб паказаць свае памеры), тупае дзвюма ці адной з пярэдніх лап ці ўдарае ёю аб які-небудзь прадмет, скрабе пярэднімі лапамі і кідае зямлю ў чалавека, «шыпіць», «пыхкае», «фукае», гыркае ці раве, ляскае сківіцамі, АЛЕ глядзіць на чалавека скоса і толькі зрэдку кідае прамыя погляды, то пры разумных дзеяннях ініцыдэнт можа быць вырашаны мірным шляхам. Калі ў такой сітуацыі стаяць спакойна, быць знешне спакойным і рашучым, то мядзведзь хутчэй за ўсё спыніцца і сыдзе.

✓ Адыходзіць ад мядзведзя неабходна без рэзкіх рухаў, спакойна, крокамі, але досыць хутка, лепш убок, імкнучыся пры гэтым апынуцца з наветранага боку, каб мядзведзь мог пачуць пах чалавека (можа прыняць чалавека за буйную жывёлу!). Адыходзячы, не паварочвайцеся спінай да звера, і толькі прайшоўшы так 10—15 метраў, можна павольна, бокам адыходзіць далей. Але калі мядзведзь пачынае ісці за вамі, спыніцеся і не сыходзьце з месца.

✓ У некаторых выпадках можна адпудзіць мядзведзя моцным і незвычайным шумам. Для гэтага можна гучна закрычаць, стукаць аб ствол дрэва, скарыстацца пятардамі, але кідаць іх не ў звера, а збоку ад яго паміж вамі і мядзведзем, уначы можна выкарыстоўваць яркі ліхтар, накіраваўшы яго ў вочы звера.

**Прыкметы агрэсіўна настроенага звера:**

✓ вушы прыціснуты да галавы,

✓ поўсць устала на карку (мядзведзь здаецца трохі гарбатым), ён не спрабуе ўставаць на заднія лапы, маўчыць і глядзіць на вас прамым поглядам.

**Вельмі верагодна, што звер цяпер кінецца на вас, і гэта будзе вельмі імкліва.**

**Вераніка КОЛАСАВА.**

Знайсці кампраміс

# ВЕЛАРУХУ — СІСТЭМНАСЦЬ

**Веласіпедны рух у сталіцы актыўна развіваецца. З кожным годам аматараў гэтага віду транспарту становіцца ўсё больш. Аб гэтым паведаміў начальнік галоўнага ўпраўлення спорту і турызму Мінгарвыканкама Міхаіл ПРАКАПЕНКА.**

— Канцэпцыя арганізацыі веласіпеднага руху ў сталіцы і стратэгічны план па яе ўвасабленні дзейнічае да 2020 года. Затым плануюцца змяненні ў дакументе, пры яго састаўленні будуць улічвацца грамадская думка, а таксама вынікі эксперыментаў, што былі праведзены ў горадзе. Напрыклад, можна сказаць аб праекце веладарожкі па вуліцы В. Харужай, дзе ўжо ёсць асобныя палосы ў абодвух напрамках руху. Магчыма, на сёння ён не самы дасканалы, але мы назіраем, як каментуюць такія новаўвядзенні гараджане, і імкнёмся хутка адрэагаваць, унесці карэктывы, калі патрабуецца, — паведаміў спецыяліст.

Працягласць магістральнай дарожкі ў сталіцы складае 27 кіламетраў, а сумешчаных агулам — 196. Супрацоўнік Мінгарвыканкама адзначыў, што яна з кожным годам будзе павялічвацца.

— Пры складанні стратэгічнага плана да 2021 года будзем уводзіць новыя праекты па развіцці веласістэмы. Па колькасці наведвальнікаў мерапрыемстваў для аматараў двухколавага транспарту можна ўбачыць, што іх з кожным годам усё больш, аднак дакладная лічба будзе агучана ў канцы гэтага года. Мы толькі за тое, каб гэты спорт развіваўся, — кажа Міхаіл Пракапенка.

Веласіпедны рух у горадзе выклікае не толькі пазітыўную рэакцыю. Цяпер у Мінску актыўна функцыянуе велашэрынг, аднак, як пракаментаваў начальнік галоўнага ўпраўлення спорту і турызму, з ім звязаныя некаторыя негатыўныя моманты:

— Сітуацыя неадназначная, мы сочым за ёй і працуем у розных кірунках па паляпшэнні такіх сэрвісаў. Час ад часу здараюцца выпадкі вандалізму або некарэктнай паркоўкі роварараў, гэта перашкаджае камфорту іншых. З'яўленне гарадскіх аператараў, а таксама арганізацыя фіксаваных велапарковак зможа сістэматызаваць велашэрынг.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

I так бывае

# КАЛІ ВАХЦЁР — ЗУСІМ НЕ ВАХЦЁР...

**Гэтыя падзеі разгортваліся ў адным са складскіх памяшканняў сталічнага прадпрыемства. У ім захоўваліся адпрацаваныя аўтамабільныя рухавікі, якія лічыліся на балансе як каляровы метал і металалом.**

Гледзячы на ўсё гэта, прадпрымальны не па ўзросце 73-гадовы вахцёр, які сачыў за маёмасцю, вырашыў прыбрацца яе да сваіх рук. У планах фігуранта было здаць рухавікі ў пункт прыёму другасная сыравіны, а атрыманыя грошы патраціць, вядома ж, на ўласныя патрэбы. Спраўбіцца з такой масай металу ў адзіночку дзядуля не змог. Тады вахцёр папрасіў пасадзейнічаць у гэтым сваіх знаёмых. Дарэчы, мужчыны нават не здагадваліся пра злачынны план вахцёра, бо думалі, што «жалеза» безгаспадарчае.

Калі на тэрыторыі прадпрыемства нікога не было, двое прыяцеляў сумесна з фігурантам патраплялі ў памяшканне, дзе захоўваліся запчасткі. Сумеснымі намаганнямі мужчыны змаглі вынесці 19 аўтамабільных рухавікоў агульнай вагой больш за чатыры тоны, якія затым вывезлі на аўтамабілі ў адну з вёсак Мінскага раёна.

Супрацоўнікамі крымінальнага вышуку Кастрычніцкага РУУС горада Мінска ў ходзе правядзення аператыўна-пошукавых мерапрыемстваў выкрадзеныя запчасткі былі выяўленыя ў гаражы, які належыць адному з таварышаў вахцёра. Ён затрыманы і змешчаны ў ізалятар часовага ўтрымання.

Як паведаміла **супрацоўніца аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама Дар'я БАБОК,** цяпер даецца прававая ацэнка дзеянням пажылога зламысніка.

**Канстанцін ЛЮТКЕВІЧ.**

# «РАБІНЗОНЫ» ПАНЯВОЛІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У Лагойскім раёне і таго не спатрэбілася. Жыхар адной з вёсак а дзявятай раніцы сышоў у грыбы. У 13.47 паступіла паведамленне пра тое, што ён знік. Але выратавальная аперацыя, па сутнасці, скончылася, ледзь пачаўшыся. У 14.15 грыбнік сам пакінуў гушчар...

— Да паходу ў лес трэба аднесціся вельмі адказна, — каментуе сітуацыю **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях Анастасія ШВАЙБОВІЧ.** — Гэта не забаўляльная прагулка ў гарадскім парку, а месца, дзе можна вельмі лёгка згубіцца. І памылкі пачынаюцца яшчэ на этапе падрыхтоўкі. Чамусьці аматары «ціхага палявання» любяць адзяваць пры паходзе ў грыбы і ягады камуфляжную вопратку. Такое ўражанне, што яны хочуць тым самым не прыцягнуць увагу нейкага нядобрага чалавека. Па законе подласці, камуфляж добра выканае сваю функцыю маскіроўкі, калі чалавека будуць шукаць у лесе. Як ты разгледзіш зялёнае на зялёным? Таму лепш надзець штосьці яркага колеру, але такое ж шчыльнае. Напрыклад, аранжавую ці чырвоную кепку або хусту з борта лятальнага апарата ўбачыць ужо прасцей.

Лес — месца без добрых арыенціраў, у адрозненне ад населенага пункта. Таму загадзя трэба прыхапіць з сабой карту мясцовасці. Добрым памочнікам стане сучасны смартфон з навігатарам. А ў аптэчку пакладзіце лекі, якія вы прымаеце. Не лішнім будзе, калі вы прыхопіце з сабой свісток. У лесе яго гук разносіцца на 2-3 кіламетры.

— Што да надвор'я, дык калі неба заціснуты хмарамі, то падарожжа па лесе лепш адкласці, — раіць Анастасія Швайбовіч. — Але і пасля гэтага яшчэ трэба зрабіць некалькі, здавалася б, нязначных, але вельмі істотных рэчаў. Родныя і блізкія мусяць ведаць, па ваш прыблізны маршрут і час вяртання з лесу. Калі гадзіна «Х» прайшла, а яны ніякай вестачкі не атрымалі, — то гэта будзе для іх знак таго, што вы заблукалі. Вельмі пажадана не ісці ў лес у адзіночку — сябар вам дапаможа, калі раптам што ў дарозе здарыцца нядобрае. З сабой вельмі пажадана ўзяць ваду, нож, запалкі і магутны павербанк, каб у дарозе ў вас была магчымасць пры необходнасці падзарадзіць тэлефон. Ён таксама можа стаць добрым маркерам, калі вы заблукаеце — па сігнале з сотавых вышак можа выліўшыць прыблізны маршрут перасоўвання.

Але што ж рабіць, калі ўжо і сонца садзіцца, а выхад з лясных нетраў так і не знойдзены? Рабіць няма чаго, трэба ўладкоўваць месца для начлегу. Для гэтага лепш за ўсё падыдзе яма ад вывернутага з коранем дрэва. Але гэтага мала. Ратавальнікі раюць зрабіць з галля імправізаваны шалаш. Цікава, што папяровы аркуш, які знаходзіцца за падкладкай курткі, зніжае цепладдачу прыблізна ўдвая. Але паперу можа спакойна замяніць і лісце. Разам з тым трэба ўлічваць, што пошукавая аперацыя можа адбывацца і ўначы. Таму трэба неяк абазначыць сваю прысутнасць, напрыклад, павесіўшы на галінку дрэва нейкі падручны прадмет.

У Беларусі амаль няма велізарных лясных гушчароў, дзе на многія дзясяткі кіламетраў вакол не сустракаецца ніякіх прыкмет цывілізацыі. Таму прыслухайцеся да гукаў і ідзіце на іх. Шум ад трактара чуваць за 3-4 кіламетры. Сабачы брэх — за 2-3. А таварны цягнік грукоча так, што яго можна распазнаць і праз 10 кіламетраў. Калі па дарозе сустрэлася лінія электрапередачы, сцежка або прасека — вось вам у літаральным сэнсе ход назад у цывілізацыю. Дапамагчы могуць і водныя аб'екты. Калі вы сустрэлі ручай або раку — ідзіце па іх беразе ўніз па цячэнні. А вось наадварот рабіць не варта: часцей за ўсё вытокі знаходзяцца недзе ў цяжкадаступных лясных масівах, і сіл на падарожжа назад можа ўжо і не застацца. І заўжды запамінайце, блізу якога населенага пункта вы ўвайшлі ў лес. Гэтая інфармацыя можа аказацца вельмі каштоўнай для ратавальнікаў.

Як паведаміў **афіцыйны прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Віталь НАВІЦКІ,** з прыцягненнем разлікаў ведамства сёлета ўжо было знойдзена ў лясах каля 200 чалавек.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# ФЭСТ У ЛЮБКАХ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Адбылася і прэзентацыя незвычайнай карты «Любкі: сядзібы і ваколіцы», для якой Вольга са сваёю сястрою Ірынай даследавалі фамільныя вясковыя радаводы і зрабілі адмысловую «энцыклапедыю» накшталт туристычнага даведніка вёскі — з вуліцамі, сядзібамі і прозвішчамі былых і цяперашніх гаспадароў. Убачыўшы сябе на адбітках, вяскоўцы не хавалі эмоцый і слёз. А потым усе разам фатаграфаваліся каля «сцяны памяці» і спявалі песні сваёй маладосці.

Фэст у Любках наведала каля васьмідзесяці чалавек. Акрама аднавяскоўцаў Вольгі, былі і былі-пявуні з суседніх Караleўцаў, і маладыя захавальнікі народных побытавых танцаў з Мінска, Гродна, Барысава, Маладзечна, Вілейкі і Смаргоні, з літоўскага Друскінінкая. Давала танцавальны майстар-клас вядомы ў харэаграфіі педагог Зінаіда Губарава-Крупская. Пад зорамі працягваліся вясёлыя скокі пад традыцыйную музыку. Гарманісты Аляксей Крукоўскі, Уладзімір Ганчароў і Мікалай Кашкан, даведаўшыся пра фэст, прыехалі з Мінска, клярнетыст Раман Яраш з Беразіна, а дудар Антон Бельскі і цымбаліст Іван Валынец з Вілейкі, капэла «Гарадзенскіх дворыкаў» дасталі з далёкага Гродна, а духавік Канстанцін Канцавы — з Магілёва, дзяўчаты-скрыпачкі з Маладзечна і Ракава. У выкананні музыкаў гучалі полькі і вальсы, факстроты і танга, кракавяк і абзрак, падэспань і нарэчанька, субота і мяцеліца, ляваніца і, нават, шаміль — болей за тры дзясяткі танцаў ведаюць і выконваюць заўзятары народнай традыцыйнай культуры.

— «Любкі-фэст» не адбыўся б, калі б у правядзенні не прынялі ўдзел мае сяброўкі з этнаграфічна-фальклорнага гурта «Кола» з Маладзечна, з якімі я не першы год прапагандую беларускую культуру, — кажа Вольга Трубач. — Спадзяюся, падзея надоўга застанецца ў памяці, а на наступны год фэст ператворыцца ў традыцыю.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

*Больш здымкаў з гэтай падзеі, а таксама з этнаграфічных маляўнкаў і відаў «любэцкіх» ваколіц глядзіце на сайце «zviazda.by».*

Скажыце, доктар...

# Для чаго рабіць флюараграфію?

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 287-18-36.

**Якія хваробы дапамагае выявіць флюараграфія і ў чым яе адрозненне ад рэнтгену? Наколькі гэта працэдура небяспечная і што за «знаходкі» выяўляюць урачы ў пацыентаў, якія некалькі гадоў не звяртаюцца да доктара? Як часта трэба праходзіць названую працэдуру? Пра гэта расказала ўрач-рэнтгенолаг 11-й гарадской паліклінікі г. Мінска Марына БАРСУКОВА.**

Флюараграфія — адна з разнавіднасцяў рэнтгенаўскай дыягностыкі, якая прымяняецца для агляду лёгкіх і грудной клеткі. Флюараграфія адрозніваецца ад рэнтгену меншым памерам і горшай якасцю здымка. Ён менш інфарматыўны, чым рэнтгенаграма, але флюараграфія атрымала шырокае распаўсюджанне, бо патрабуе меншых затрат і дазваляе абследаваць за адзін і той жа час большую колькасць пацыентаў. Таму калі ў вас няма ніякіх падазроных сімптомаў і трэба атрымаць толькі пацвярджэнне таго, што хвароба адсутнічае, мэтазгодна рабіць менавіта флюараграфію.

Сёння плённую флюараграфію выцясняе лічбавая, а сучасныя апараты даюць больш магчымасцяў. Атрыманы здымак можа быць выведзены на экран манітора, захаваны ў базе даных.

***— Марына Дзмітрыеўна, якія захворванні дазваляе выявіць флюараграфія?***

— Запаленчыя працэсы ў лёгкіх — пнеўманію, туберкулёз. Таксама анкалагічныя захворванні, паталагічныя ўтварэнні, напрыклад, кісты, абсцэсы, каверны, акрамя гэтага, фіброзы, іншародныя прадметы. На здымку мы бачым не толькі лёгкія, але і цень сэрца, часам трахею і буйныя бронхі, пазваночнік, рэбры. Усё гэта ацэньваецца пры апісанні флюараграмы.

***— Цікава, а бранхіт выявіць можна?***

— Бранхіт — гэта клінічны дыягназ, ён не адносіцца да рэнтгеналагічных заключэнняў. Прыкметы бранхіту навят на рэнтгене ўскосныя, а на флюараграфіі, як правіла, не выяўляюцца.

***— Часта даводзіцца чуць, што на першапачатковых стадыях рак на флюараграфіі не бачны...***

— Флюараграфія была распрацаваная ў першую чаргу для выяўлення туберкулёзу і не з'яўляецца метадам дыягностыкі раку. На першапачатковых стадыях выявіць яго на флюараграфіі, асабліва калі рак цэнтральны, малаверагодна. Калі пухліна размяшчаецца за ценем сэрца ці ў бронхах, то на флюараграме мы не проста не пабачым. Таму часам рак на флюараграфіі выяўляецца на запушчаных стадыях, калі пухліна заняла большую долю аб'ёму лёгкага. Як правіла, гэта здараецца ў пацыентаў, якія доўгі час не абследаваліся, не звярталіся да ўрача шмат гадоў. Яны прыходзяць і скардзяцца на кашаль, робяць флюараграфію, а там вялікая пухліна.

***— Ці трэба штогод праходзіць флюараграфію?***

— Флюараграфія выконваецца раз на два гады. Але ёсць групы людзей, якія праходзяць яе раз на год. Сюды адносяцца асобы, чыя дзейнасць звязана з магчымасцю захварэць на туберкулёз, напрыклад, медыцынскія работнікі, а таксама тыя, хто працуе ў арганізаваных калектывах. Таксама раз на год праходзяць яе людзі з групы медыцынскай рызыкі — тыя, хто мае, напрыклад, цукровы дыябет, ВІЧ, хранічныя хваробы лёгкіх. І людзі, якія вядуць асацыяльны лад жыцця.

***— Наколькі гэта небяспечная працэдура? Ці вялікая прамянёвая нагрузка пры праходжанні флюараграфіі?***

— Яна мінімальная. Знаходзячыся ў спякотны дзень на сонцы некалькі гадзін, мы атрымліваем такую ж прамянёвую нагрузку. Тут не трэба блытаць флюараграфію з іншымі рэнтгеналагічнымі даследаваннямі: там большая прамянёвая нагрузка і іншая якасць здымка.



Апошні час у нас добрае абсталяванне — апарат сам разлічвае дозу ў залежнасці ад камплекцыі чалавека. Камп'ютар самастойна прапануе эфектыўную дозу, яна сапраўды мізэрная. Падчас адпачынку ў гарачых краінах можна атрымаць большую дозу, чым падчас флюараграфіі.

**«Часам рак на флюараграфіі выяўляецца на запушчаных стадыях, калі пухліна заняла большую долю аб'ёму лёгкага. Як правіла, гэта здараецца ў пацыентаў, якія доўгі час не абследаваліся, не звярталіся да ўрача шмат гадоў».**

***— Як сябе праяўляе туберкулёз? У якіх выпадках трэба ісці на флюараграфію?***

— Гэта доўгі кашаль з макротай, які, як правіла, можа суправаджацца кровахарканнем, акрамя таго, агульная слабасць, хуткая стамляльнасць, страта вагі і апетыту, доўгі час трымаецца субфебрыльная тэмпература — да 38 градусаў. Праўда, гэтыя сімптомы характэрныя для актыўнай стадыі. На пачатковых этапах туберкулёз можа працякаць бессімптомна. Таму ўсё ж важна не забываць своечасова праходзіць флюараграфію. Нават пры адсутнасці сімптомаў на здымку могуць быць змяненні.

Ёсць людзі, якіх турбуе кашаль, і яны свядома прыходзяць на гэтую працэдуру. Накіраванне не патрабуецца — дастаткова прыйсці з пашпартам. Хтосьці даведаўся, што выявілі туберкулёз у знаёмага, — таксама звяртаецца, бо быў у групе кантакту.

***— Усім у дзяцінстве робяць прышчэпкі ад туберкулёзу. Маючы яе, можна ўсё роўна заразіцца?***

— Так, заразіцца можа кожны чалавек. Мы не ведаем, з кім едзем у грамадскім транспарце ці стаім у касу ў супермаркеце. Асабліва рызыкуюць людзі, якія доўгі час знаходзіліся ў кантакце з хворым і ў памяшканнях, якія дрэнна праветрываюцца, напрыклад, у казарме, турэмнай камеры ці навят у сям'і. Таксама рызыка заражэння залежыць ад таго, у якім стане знаходзіцца ваш імунітэт. У людзей з панІжаным імунітэтам рызыка ўзрастае.

***— Ці можна адразу пасля флюараграфіі рабіць рэнтген?***

— Калі падчас флюараграфіі ў нас узнікаюць пэўныя падазрэнні, маецца адмоўная дынаміка, мы інфармуем тэрапеўта, які выклікае пацыента, і той павінен прайсці рэнтген. Такое абследаванне робіцца толькі па паказаннях і пры безумоўнай перавазе карысці над шкодай для здароўя пацыента.

А вы ведалі?

# ПУЧОК У ДЗЕНЬ

## Чым карысная пятрушка?

**Пятрушка — адзін з папулярных відаў зеляніны на нашым стале. Цікава, што яе прымянялі здаўна, прычым не заўсёды ў кулінарных мэтах. У антычнай Грэцыі яна служыла... упрыгажэннем на магілах продкаў, таксама з яе рабілі вянкі пераможцам алімпійскіх гульняў. А вось выкарыстоўваць пятрушку ў ежу пачалі старажытныя рымляне, праўда, яна падавалася толькі знатным патрыцыям... Сёння пятрушка дапаўняе і прыпраўляе амаль любую страву, яе вырошчваюць на агародах і балконах аж да надыходу першых зімовых замаразкаў. Якія вітаміны ўтрымлівае гэта зеляніна і чаму пучок пятрушкі больш карысны, чым паўкіло апельсінаў, дапамагла разабрацца ўрач-лабарант Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ірына БАЦЯН.**

Есці пятрушку ў салатах, у якасці прыправы для гарніраў і іншых страў мы прызвычаіліся. Нават з гарачай ежай гэта расліна не траціць сваіх карысных уласцівасцяў. Але важна ведаць: зеляніна дадаецца ў гатовую страву, а не падчас прыгатавання.

**У адным пучку пятрушкі ўтрымліваецца больш вітаміну С, чым у паўкіло апельсінаў. Праўда, каб захаваць у зеляніне як мага больш яе карысных рэчываў, яе варта наразаць, а не секчы.**

— У пятрушцы ўтрымліваецца вялікая колькасць вітамінаў, яна спрыяе пахудзенню і ўмацаванню імунітэту, — пералічвае Ірына Бацян. — Дзякуючы вітаміну А яна дапамагае захаваць зрок, удзельнічае ў будове бялку з незаменных амінакіслот, бо ў 100 грамах зеляніны іх утрымліваецца 4,4 грама. Я б параіла ўжываць пятрушку вегетарыянцам, бо яны адмаўляюцца ад мяса і ў сувязі з гэтым іх арганізм адчувае дэфіцыт амінакіслот.

Таксама пятрушка ўмацоўвае і адбельвае зубы. Адбельванне адбываецца дзякуючы множству арганічных кіслот, а ўмацаванне — з-за фосфару і кальцыю, якія ў ёй утрымліваюцца. Дзякуючы вітамінам Е, А і С і фоліевай кіслаце пятрушка прадухіляе ранняе старэнне. Вітаміны выступаюць у якасці антыаксідантаў, а фоліевая кіслата спрыяе хуткаму абнаўленню клетак. У адным пучку пятрушкі ўтрымліваецца больш вітаміну С, чым у паўкіло апельсінаў. Праўда, каб захаваць у зеляніне як мага больш яе карысных рэчываў, яе варта наразаць, а не секчы.

— Адна сталовая лыжка пятрушкі забяспечвае наш арганізм сутачнай нормай такога неабходнага мікраэлемента, як марганец, — нагадвае ўрач. — Яна, дарэчы, з'яўляецца аптымальнай дабаўкай у меню тых, хто жадае пахудзець.

❍ ШТО ЗАНАДТА...

— Прачытаўшы пра карысць гэтай культуры, некаторыя могуць вырашыць, што шкоды ад яе дакладна не будзе і можна есці колькі заўгодна. Але гэта не так, не варта злоўжываць ніякім прадуктам, у тым ліку і пятрушкай, — папярэджвае Ірына Бацян. — Ад гэтага можа ўзнікнуць галаўны боль, млоснасць, вадкі стул і моцнае зніжэнне вагі. Варта прытрымлівацца сутачнай нормы ўжывання гэтай зеляніны. Яна складае ўсяго 50 грамаў (сярэдні пучок). Проціпаказаннямі да ўжывання пятрушкі з'яўляюцца індывідуальная непераноснасць, вострыя захворванні мочапалавой сістэмы і нырак, абвастрэнне хвароб стрававальнай сістэмы і ў некаторых выпадках — цяжарнасць.

Яшчэ адна перавага гэтай расліны — захаванне практычна ўсіх карысных кампанентаў незалежна ад тыпу апрацоўкі. У свежым выглядзе ў шчыльным пакеце без доступу кіслароду пятрушка ляжыць каля двух тыдняў. Гэты тэрмін можна падоўжыць, калі змясціць галінкі ў шклянку з вадой. Яшчэ адзін спосаб зберагчы ўражай — замарозіць ці высушыць зеляніну. Перад замарозкай расліну трэба памыць і прасушыць, нарэзаць, скласці ў герметычны пакет і змясціць у маразільную камеру. Замарожваюць расліныя прадукты ў асноўным у камерах з сухой замарозкай, але падыдуць і статычныя — расліна не згубіць сваіх карысных уласцівасцяў.

Зручна карыстацца і сушанай пятрушкай. Высушыць яе можна рознымі спосабамі. Лепш за ўсё раскласці на тканіне і пачакаць, пакуль яна высахне ў натуральных умовах. Каб паскорыць працэс, можна выкарыстаць духоўку. Прыадчыніце дзверцы духавой шафы і сушыце зеляніну пры тэмпературы каля 40 градусаў.

# АСАБЛІВЫЯ, ЯК УСЕ

**На Пастаўшчыне прайшоў інклюзіўны фестываль, дзе бацькі маглі адпачыць, а дзеці — стаміцца ад прыгод**

**У Паставах у спартыўна-турыстычным комплексе «Азяркі» 18 жніўня прайшоў Першы інклюзіўны фестываль для дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі «Асаблівыя, як усе». Тут сабраліся сем'і, якія выхоўваюць асаблівых дзяцей, не толькі з усёй Пастаўшчыны, але і з суседніх раёнаў — Браслаўскага і Глыбоцкага. А валанцёры, аніматары ды іншыя ўдзельнікі, якія і дапамагалі зрабіць свята, з'ехаліся ледзь не з усёй Віцебшчыны. «Наша мэта — вывесці за межы кватэры асаблівых дзяцей і іх бацькоў, даць апошнім магчымасць адпачыць і абстрагавацца ад клопату пра хворае дзіця», — сказала нам арганізатар фестывалю пастаўчанка Рыта ШЫЛЕЙ. Улічваючы, што і праз тры гадзіны, на якія быў разлічаны фестываль, госці не спяшаліся пакідаць спартыўна-турыстычны комплекс, мэта была дасягнута.**

Соня ШЫЛЕЙ.

## АБ'ЯДНАЦЬ НЕАБЫЯКАВЫХ І...

— Ідэя правядзення такога свята ўзнікла ў мяне, калі мы з дачкой былі на рэабілітацыі ў Польшчы, — кажа Рыта Шылей. — Там праводзяцца бясплатныя гарадскія мерапрыемствы, дзе для дзяцей і дарослых прадугледжаны розныя забавы, пачастункі і падарункі. Такія святы праводзіліся і ў варшаўскай клініцы OLINEK, дзе мы знаходзіліся. Іх арганізуе або сам гаспадар, або хтосьці з сем'яў дзетак. Вось у чэрвені мы з маёй Соняй пабывалі на такім свяце, прысвечаным Дню абароны дзяцей. Гэта на самай справе стварае класны эмацыянальны фон.

А вярнуўшыся дадому, Рыта вырашыла арганізаваць штосьці падобнае ў Пастаўскім раёне. Прычым фестываль мяркуе атрымаўся маштабны. Для ўдзелу ў ім зарэгістравалася больш за 80 сем'яў! А калі ўлічваць, што ў многіх сем'ях некалькі дзетак, то ў «Азяркі» толькі малых прыехала больш за сотню, а таксама больш за паўтары сотні бацькоў.

Але пра ўсё па парадку. Арганізаваць такое вялікае мерапрыемства ў адзіночку, безумоўна, немагчыма. З самага пачатку Рыце дапамагала валанцёр Настасся Макаед. Падтрымалі дзяўчат многія — і дзяржаўныя ўстановы, і мясцовыя прадпрымальнікі, і проста нераўнадушныя людзі. Першым, да каго звярнулася Рыта, быў генеральны дырэктар установы «Фізічная культура, спорт і турызм Пастаўскага раёна» Станіслаў Чымбург, які выдзеліў пляцоўку для фестывалю. Падтрымалі ідэю ў райвыканкаме і мясцовым цэнтры карэкцыйна-развівальнага навучання і рэабілітацыі. Адгукнуліся і іншыя арганізацыі і прадпрымальнікі, а таксама валанцёры.

У выніку гасцей забаўлялі аніматары, якія прыехалі з Глыбокага, Полацка і Мядзела. Фатографы арганізавалі чатыры фотазоны, дзе адразу можна было атрымаць свае фотаздымкі. Машыны з мыльнымі бурбалкамі, паветраныя шарыкі, роставыя лялькі і цыркавая студыя, міні-заапарк і катанне на конях — новыя прыгоды і ўражанні падпільноўвалі дзяцей літаральна за кожным дрэвам. Кіраваў святам прафесійны вядучы — Аляксей Грамыка спецыяльна прыехаў з Масквы.

У фудзоне можна было пачаставацца смажанай бульбай, побач варылася рыбная поліўка і смажыліся каўбаскі. Пагранічнікі разгарнулі палявую кухню. Хапала і салодкіх пачастункаў — куды ж без іх. Вагончык з салодкай ватай, напрыклад, выставіў мясцовы прадпрымальнік. Іншыя пачастункі, той жа зефір ручной работы, даведаўшыся пра свята, перадавалі сем'і з асаблівымі дзецьмі нават з Магілёва.

Не застаўся ўбаку і дзіцячы рэабілітацыйна-аздараўленчы цэнтр «Ветразь». Яго галоўны ўрач Сяргей Петухоў, які не першы год працуе з асаблівымі дзецьмі, не толькі даў слушныя парады наконт арганізацыі святочнай пляцоўкі, але і выпусціў 20 валанцёраў з ліку медыкаў цэнтра, якія аказвалі прафесійную дапамогу. Яны арганізавалі санітарную зону для дзяцей і работу псіхолага.

— Такія дзеці — публіка асаблівая і непрадказальная. Я вельмі хвалявалася — усё ж упершыню давялося арганізоўваць такое свята, — прызнаецца Рыта Шылей. — Але ўсё прайшло выдатна. Мерапрыемства атрымалася незабыўнае! Бацькі і дзеці разняволіліся, у канцы свята гэта была адна вялікая сям'я. Я атрымала і атрымліваю дагэтуль многа цёплых слоў падзякі. Вельмі хацелася б зрабіць гэта свята традыцыйным, хоць яшчэ з раніцы ў правы бок — рука і нага. Сям'я шмат часу і сродкаў укладала ў рэабілітацыю дачкі. У два гады яна самастойна пайшла. Некалькі разоў бацькі выязджалі за мяжу — у польскія і бельгійскія клінікі, і нагу ўдалося адпавіць. Рука пакуль не працуе, але ў сям'і добра ўсведамляюць, што рэабілітацыя — працэс вельмі доўгі.

— Соня — сапраўдны змагар! І вельмі правільна ставіцца да ўсяго: у яе няма праблем. Нягледзячы на затрымку маўлення, яна наведвала звычайны дзіцячы садок. А з 1 верасня пойдзе ў першы клас звычайнай школы. Таксама яна наведвае секцыю каратэ — нам параілі польскія рэабілітолагі. І робіць вялікія поспехі: у яе вялікая матывацыя не адставаць ад іншых дзяцей, і яна навучылася таксама рухам, якія не ўдавалася асвоіць у клініцы. У Соні шмат сяброў. Рухаюся пра свята, перадавалі сем'і з асаблівымі дзецьмі нават з Магілёва.

Рыта ШЫЛЕЙ з дачкой Соняй.

## ...ЗРАБІЦЬ БОЛЬШ, ЧЫМ МОЖАШ

У сям'і самой Рыты малодшая дачка, сямігадовая Соня, таксама асаблівая. Яна нарадзілася абсалютна здаровай, але пасля прышчэпкі ў нованароджанай дзяўчынкі здарыўся інсульт.

— Я не ўдзельнічаю ў дыскусіях наконт прышчэпак у сацсетках і на форумах. Я не супраць прышчэпак, і мая старэйшая дачка Дар'я вакцынавалася, як і ўсе дзеці. Але так склаліся абставіны: нам з Соняй проста не пашчасціла, мы трапілі ў сумную статыстыку, — кажа Рыта Шылей. — Соню адразу даставілі ў рэанімацыю Маладзечанскай бальніцы, і там медыкі зрабілі ўсё магчымае, дзякуючы чаму выратавалі яе ад больш цяжкіх наступстваў.

Аднак дыягназу ДЦП, хоць і ў лёгкай ступені, усё ж не ўдалося пазбегнуць. У дзяўчынкі быў паралізаваны нядзелю я так не думала.

ецца хтосьці на інваліднай калясцы ці ходзіць нагамі — яна не робіць адрозненняў. Яе сябры-калясачнікі катаюць яе ў сябе на каленях — для Соні гэта абсалютна нармальна.

Рыта і сама выразны прыклад таго, як жыць, заўважаючы не праблемы, а прыгажосць вакол. Яна, акрамя таго, што даглядае дачку, займаецца фатаграфіяй. Гэта вясельныя і сямейныя фотаздымкі, а таксама і яе асабістыя праекты. Адзін з іх — «Асаблівыя, як усе», які ў хуткім часе пастаўчанка збіраецца паказаць.

— Гэта праект не пра хваробу. Ён пра маму, тату, сяброўства. Я хачу паказаць асаблівых дзяцей шчаслівымі. Ёсць каманда ў Мюнхене, якая прапанавала мне зрабіць выстаўку ў Германіі. Але мне хацелася б спачатку паказаць яго на радзіме.

Як сапраўдны перфекцыяніст, Рыта лічыць, што праект пакуль не гатовы.

— У мяне ёсць яшчэ некалькі задум. Напрыклад, сфатаграфаваць сям'ю святара, у якой таксама выхоўваецца асаблівае дзіця. Гэта такі пасыл для таго, каб людзі пачалі задаваць сабе правільнае пытанне — не «за што?», а «для чаго?».

Таксама ў планах сфатаграфаваць тат, якія не пакінулі сям'ю з асаблівым дзіцем. А яшчэ паказаць тэму адносін братоў і сясцёр, якія няпроста выбудаваць, калі ў сям'і з'яўляецца асаблівае дзіця.

...Агнія Барто належыць знакамітая фраза «Амаль у кожнага чалавека бываюць у жыцці хвілінкі, калі ён робіць больш, чым можа». У кагосьці такіх хвілін няшмат, а хтосьці пражывае так амаль усё жыццё. Наша гераіня — якраз з апошніх. Таму можна не сумнявацца, што фестываль стане традыцыйным.

**Алена КРАВЕЦ.**
**Фота Аляксея ЯЦЫНЫ.**

## Алесь БАДАК:

# «...УСЯ ПАЛІТРА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ»

**Не за гарамі 2020 год. І, несумненна, у розных галінах дзейнасці думаюць пра перспектывы, пра тое, якім наступны год павінен быць у тым ці іншым кірунку. Так і ў выдавецкіх клопатах — нельга працаваць, жыць без уяўлення перспектыў, уяўлення пра заўтрашні дзень. Мы сустрэліся з дырэктарам выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесем БАДАКОМ, каб пагаварыць пра найбліжэйшыя і, магчыма, больш далёкія перспектывы.**

***— Алесь Мікалаевіч, якім будзе наступны год для вашага выдавецтва?***

— Спадзяюся, што плённым. Ужо сёння мы ўяўляем, якія кнігі выпусцім, некаторую частку з іх ужо пачынаем рыхтаваць. На крайні выпадак ёсць рукапісы, фарміруюцца анонсіны з аўтарамі. А самае галоўнае — інфармуем бібліятэкі і кнігарні пра канкрэтныя планы выдання кніг у 2020 годзе.

***— І колькі назвалі кніг збіраецеся выдаць? На чым выбудоўваеце галоўныя акцэнты?***

— Перш-наперш у полі зроку «Мастацкай літаратуры» — зразумела, мастацкая літаратура. Як класіка, так і сучасная. Гэта наш традыцыйны клопат. І здраджваць яму мы не збіраемся. А што да колькасці назваў, то ўх плануем выдаць 85. Праўда, адразу заўважу, што гэтыя арыенціры носяць характар перспектыўны. Магчыма, нешта дадасца. А штосьці — пры ўмове, што эканоміка выдання будзе кульгаць, што не будуць сабраны замовы, — давядзецца ўсё ж пакуль што адкласці. Канчатковa зацвердзім план 2020 года крышачку пазней, недзе праз паўтара-два месяцы.

***— Вы гаварылі пра класіку... Кнігі каго з вядомых пісьменнікаў пабачаць свет?***

— Працягнем выданне «Залатой калекцыі беларускай літаратуры»...

***— Прабачце, гэта 50-томнік...***

— Так, гэта 50-томнік, які фактычна адлюстроўвае ўсю гісторыю беларускай літаратуры. Выпускам 19-ы том — у яго ўвойдуць аповесці 1920—1930-х гадоў. А наступны — 20-ы — будзе прысвечаны паэзіі перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Мяркуем выдаць і 21-ы том, у які ўвойдуць найлепшыя творы вялікага беларускага драматурга, народнага пісьменніка Беларусі Кандрата Крапівы. Як на мой розум, такія бібліятэку варта мець дома кожнаму настаўніку беларускай мовы і літаратуры. Іначай як жа выкладаць родную літаратуру?! Ды і для літаратуразнаўцаў, крытыкаў, для школьных і ўніверсітэцкіх бібліятэк такая «Залатая калекцыя беларускай літаратуры» — неацэнны скарб.

Фота Кастуся ДРОЗДА

***— У «Мастацкай літаратуры» выдаваліся ў апошнія гады і зборы твораў...***

— Працягваем гэты кірунак і цяпер. Выйдуць у 2020 годзе два тамы з 25-томнага Збору твораў Уладзіміра Караткевіча — дзевятнаццаты і дваццаты. А яшчэ — пяты і шосты тамы з дзесяцітомніка народнага пісьменніка Беларусі Янкі Брыля. І па гэтым жа раздзеле «Зборы твораў, выбраныя творы» яшчэ выдадзім зборнік народнага паэта Беларусі Максіма Танка «Выбраныя творы, успаміны, фотаздымкі». Павінен пабачыць свет і раман Алеся Адамовіча «Сыноўя уходят в бой».

***— А што з сучаснай прозы і паэзіі прыйдзе кнігамі да чытача ў 2020 годзе?***

— Анатоль Бутэвіч, Ягор Конеў, Алег Ждан, Валеры Гапееў, Алесь Казека, Наталля Канстанцінава, Ларыса Калужэніна, Георгій Марчук, Андрэй Федарэнка і іншыя пісьменнікі пазнаёмяць чытача з новымі сваімі творамі. Асобна хацеў бы выпучыць раман Андрэя Федарэнкі «Жэтон на метро». Псіхалагічны дэтэктыў, які знешне працягвае тэму раней вядомых твораў пісьменніка — «Афганскай шкатулкі» і «Шчарбатага талеру». Памятаеце, па «Шчарбатым талеры» была знята кінакарціна на «Беларусьфільме»? Толькі згаданыя творы ў большай ступені адрасаваны да дзіцячага чытача, да падлеткаў, а вось «Жэтон на метро» разлічаны на дарослую чытацкую аўдыторыю. У межах крымінальнай гісторыі разгортваецца вечны сюжэт злачынства і пакарання.

Упэўнены, што даспадобы прыйдзецца чытачу і кніга аповесцяў Ягора Конева «Новыя палескія рабінзоны». Не буду пераказваць сюжэт твора, які даў назву зборніку, — вельмі ўжо, пагадзіцеся, красамоўная назва. А вось аповесці «Нёманскі шлях Андрэя Станкевіча», «Андрэй Станкевіч і Таемнае мастацтва» і «Суддзя Станкевіч і вагі Феміды» запрашаюць нас у XVI стагоддзе, знаёмяць са славутым следчым таго часу. Творы Ягора Конева досыць дынамічныя, напоўненыя дзеяннем, багатыя на розныя прыдумкі. Чытаюцца ўсе аповесці лёгка, нязмушана.

Паспрабавалі мы яшчэ і паэксперыментаваць вось у якім плане. Рыхтуем два зборнікі апавяданняў з вызначнымі тэматычнымі абсягамі — пра каханне («Вераснёвыя ночы») і пра нашых братоў меншых, пра жывёл («Святая птушка»).

***— У чым жа эксперымент?***

— Пад адной вокладкай сабраны як класічныя творы, так і апавяданні сучаснікаў. Вось у кнізе «Вераснёвыя ночы» Якуба Коласа, Кузьму Чорнага, Міхася Зарэцкага, Івана Мележа, Івана Шамякіна, Івана Навуменку, Анатоля Кудраўца, Вячаслава Адамчыка дапаўняюць героі нашых сучаснікаў Аляксея Дударава, Андрэя Федарэнкі, Алены Брава і пісьменніка ўзроўню. Мне здаецца, у такім зборанні ёсць пэўная логіка — тут і партрэт беларускай прозы праз многія дзесяцігоддзі, і шматаблічча гераіні. Праз такія зборнікі прыадкрываюцца і вобразы прадстаўнікоў нашага народа з розных пакаленняў. Хіба не цікава паўзірацца ў думкі і памкненні папярэднікаў?.. А следам — і паразважаць, наколькі мы падобныя ці адрозныя.

Дарэчы, жаданне паяднаць розныя эпохі, розныя часіны кіравала намі, калі мы праектавалі серыю «Бібліятэка гістарычнай прозы». Збіраемся ў ёй выдаць творы Леаніда Дайнекі («Меч князя Вячкі»), Кастуся Тарасава («Пагоня на Грунвальд»), Віталя Чаропкі («Храм без Бога»). У выхадных звестках пазначым стагоддзе, да якога прымеркаваны змест твора. А яшчэ дададзім у кожны том архіўныя дакументы, што дапоўняць мастацкі тэкст. Такім чынам, будзем спадзявацца, за гады будзе выкладзена гісторыя Айчыны праз ёмісты збор кніг.

***— У свой час у Мінску было выдавецтва «Юнацтва», якое працавала з разлікам на юнага чытача, на дашкольнікаў, малодшых школьнікаў, падлеткаў, юнакоў і дзяўчат. Пасля выдавецтва далучылі да «Мастацкай літаратуры». Значыць, вы і гэтымі тэматычнымі абсягамі апякуецеся?***

— Так, мы фактычна аднасна і функцыі «Юнацтва» выконваем. У тэматычным плане на 2020 год да такіх кніг можна смела аднесці больш за 30 назваў. І таксама — размова і пра класікаў, і пра сучаснікаў. Збіраемся выдаць кнігі Раісы Баравіковай, Івана Юркіна, Пятра Васючонкі, Галіны Пшонік, Ірыны Тулупавай, Міхася Пазнякова, Мікалы Мятліцкага, Марыны Помаз-Лайковай... Серыя «100 пытанняў пра Беларусь» будзе складацца з асобных лаканічных, вельмі ілюстрацыйных зборнічкаў — «10 пытанняў пра беларусаў», «10 пытанняў пра нашых славутых гістарычных асоб», «10 пытанняў пра беларускія гарады і вёскі», «10 пытанняў пра беларускія рэкі і азёры», «10 пытанняў пра звяроў» і г. д. Году малой радзімы прысвяцілі серыю «Нашы сімвалы» — выйдуць калектыўныя зборнікі вершаў «Васілёк і валошка», «Буслава айчына», «Зубры-гаспадары», «Бульбінка», «Лён-лянок», «Шыпшынавыя пацеркі». Я яшчэ назваў бы гэтую адмысловую серыю «школай радзімазнаўства». Імкненне выхоўваць патрыятычныя пачуцці — самая важкая сацыяльная, грамадзянская задача для пісьменнікаў.

***— Што яшчэ дададзіце, Алесь Мікалаевіч, да расповеду пра планы «Мастацкай...» у 2020 годзе?***

— Гатовы расказваць пра кожную кнігу досыць падрабязна. Але спяшаюся заўважыць, што выдавецтва не забылася пра такіх аўтараў, як народны паэт Рыгор Барадулін, як Алесь Пісьмянкоў, Аляксей Пысін, Віктар Карамазаў, Генрых Далідовіч...

***— У выдавецтва ёсць серыя «Жыццё знакамітых людзей Беларусі». Таксама з яе за гады склалася вялікая і цікавая бібліятэка, якая дапамагае стварыць асветніцкі партрэт нашай Айчыны праз персаналіі, расповед пра жыццё, творчасць сапраўды цікавых нашых суайчыннікаў. За мінулыя гады у серыі былі выдадзены кнігі пра Янку Купалу, Якуба Коласа, Уладзіміра Караткевіча, Кузьму Чорнага, Янку Маўра... Ці будзе працяг у серыі ў 2020 годзе?***

— Ужо рыхтуем да выдання ў «ЖЗЛБ» кнігі пра народнага пісьменніка Беларусі драматурга Андрэя Макаёнка і вядомага беларускага дзяржаўнага дзеяча Аляксандра Кузьміна. Мне здаецца, асабліва цікавай атрымаецца кніга пра Аляксандра Трыфанавіча. Яго біяграфія напоўнена многімі падзеямі XX стагоддзя. Кузьмін больш за дваццаць гадоў працаваў у ЦК КПБ, доўгі адрэзак часу займаў пасаду сакратара ЦК па ідэалогіі. Сябраваў з многімі творчымі людзьмі. Захаваліся ўспаміны Васіля Быкава, Івана Шамякіна, многіх пісьменнікаў, гісторыкаў пра сустрэчы, размовы з Кузьмінам, вядомы яго ўнёсак у стварэнне серыі гісторыка-дакументальных хронік «Памяць», якая ў Беларусі была прысвечана кожнаму раёну краіны.

***— Новыя кнігі — гэта новыя сустрэчы, новыя з'явы. І можна толькі падзякаваць выдавецтву «Мастацкая літаратура», што яно робіць усё магчымае, каб іх было як мага болей!***

**Гутарыў Мікола БЕРЛЕЖ.**

Новыя кнігі

# Мустай Карым: пісьменнік на ўсе часіны

**Выдавецтва «Мастацкая літаратура» пры садзейнічанні Пастаяннага Камітэта Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі выдала кнігу народнага пісьменніка Башкартастана Мустая Карыма «Доўгае-доўгае дзяцінства».**

Мустай Карым, чыё стагоддзе неўзабаве будуць адзначаць у Расіі, — лаўрэат Ленінскай прэміі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, Герой Сацыялістычнай Працы, пісьменнік-франтавік. На выніках конкурсу «Вялікія імёны Расіі» міжнародны аэрапорт Уфы атрымаў яго імя.

У кнігу, сабраную ў Мінску, увайшла аповесць «Доўгае-доўгае дзяцінства» (менавіта за гэты твор башкірскі пісьменнік быў адзначаны Ленінскай прэміяй), а таксама нарысы, інтэрв'ю, якія паказваюць повязь класіка адной з нацыянальных літаратур Расіі з Беларуссю, іншымі куточкамі постсавецкай прасторы. Сваімі развагамі пра творчасць старэйшага таварыша дзеліцца ў зборніку народны паэт Кабардзіна-Балкарыі Саліх Гуртуеў. Пра Мустая Карыма расказвае ў эмацыянальным, трапяткім эсэ башкірская паэтэса Зульфія Хананава — «Наш Мустай Карым». Нашым, сваім з'яўляецца башкірскі класік і для народнага паэта Туваашві Валеры Тургая. У кнізе змешчана яго інтэрв'ю «Народ жывы, пакуль памятае сваіх паэтаў», якое чувашскі калегалітаратар узяў у свайго паплечніка шмат гадоў назад. Праз згаданыя тэксты, праз усю творчасць Мустая Карыма праходзяць яго сардэчныя, душэўныя перажыванні за чалавека. Тонкі лірык, ён ва ўсіх сваіх творах заставаўся грамадзянінам высокага гарту, патрыётам Айчыны і свайго народа.

Тое, што кніга Мустая Карыма і адначасова кніга пра Мустая Карыма выйшла ў Мінску, зусім не выпадкова. У «Мастацкай літаратуры» істотная ўвага аддаецца нацыянальным літаратурам Расіі. Як сведчанне — і кніжная серыя «Сябры-на: паэзія народаў Расіі». У ёй ужо пабачылі свет некалькі вершаваных зборнікаў. Адзін з іх калектыўны, складаецца з паэтычных здабыткаў паэтаў 14 народаў Расіі. А яшчэ традыцыяй стаў выпуск альманаха перакладной літаратуры на беларускай мове «Далягляды». Неўзабаве пабачыць свет чарговы гадавік, на старонках якога знойдзецца месца многім цікавым творцам Расіі.

**Кастусь ЛЕШНІЦА.**

Хто каго?

**Што было, — было: адзін з вернікаў і ў адчаі, можна сказаць, у сінагогу прыйшоў, сказаў: «Рэбе, у мяне такія праблемы, такія праблемы! Я не магу з імі справіцца... Што рабіць? Што думаць?..» — «Мойша, — пачуў у адказ, — Бог кожнаму пасылае праблемы па ягоных сілах. Так што ў цябе адно з двух: альбо ты можаш з імі справіцца, альбо гэта не твае праблемы».**
**То-бок у Мойшы варыянтаў два. У нашым жа звяздоўскім конкурсе на лепшы подпіс да здымка, мусіць, больш за сто дваццаць два, а выбрась давядзецца адзін — найлепшы. Праўда, гэта будзе потым, а пакуль...**

«Зноў доўгачаканая рубрыка! Нарэшце!.. Разумеем, што дасць яна не проста, — пішуць **сумэнцы Астроўскія з Мінска,** — але ж сёння без яе, без гумару, без чарговага задання ну проста ніяк!.. Гэты вось, новы здымак (можна яшчэ раз глянуць на верхні. — **Аўт.**) напомніў нам многае: і цудоўныя мясціны роднага краю, і ваеннае ліхалецце, і Чарнобыль... Яно і зразумела: вельмі шмат што жыццё кладзе нам на плечы...»

Адкуль, трэба разумець, і досыць сумнае:

*Факт на здымку не з вясёлых:*
*Кветак шмат,ды гінуць пчолы,*
*Бо аграрнікі заўзята*
*Распыляюць хімікаты:*
*Ім што поле, то нагода,*
*А прыродзе — шкода, шкода,*
*Ад якой — і як заўсёды —*
*Шмат праблем...*
*Яшчэ і з мёдам.*

Пра іншыя, не менш балючыя, нагадваюць іншыя чытачы — у тым ліку і ад імя героя... **Спадар Віктар Сабалеўскі з Узды,** у прыватнасці, піша:

*Звабілі ад гмахаў*
*Родныя сялібы...*
*Ды ні ў лузе пахаў,*
*Ні ў ставочку рыбы.*
*Нібы марсіянін,*
*Здзіўлены, гуляю.*
*Ганьба нам, зямляне:*
*Чысціні шукаю!*

А замест яе (і з тога ж канверта)...

*Ля Дзвіны ці Нёмна,*
*Прыпяці ці Сожа*
*«Шчасцейка» раптоўна*
*Напаткаці можа:*
*Ці вада з мазутам,*
*Ці ў траве бляшанка...*
*Ад такіх пакутаў*
*Засцярогся Янка.*

Цяжка ў прыведзенае, вядома ж... А што рабіць? Зразумела, прыстасоўвацца. Вось і прыстасаваліся, бедныя. І людзі, і пялеткі, і кветкі. Больш за тое... «Іх пылку, які ў час цвіцення рассейваюць тычынкі ў пошуках свайго песціка, заўсёды бывае з запасам. І не дзіва, што для чалавека пылок той можа стаць як моцным стымулятарам, так і моцным алергенам», — з веданнем справы піша **спадар Іван Сімянёнак з Паставаў.** Яго радкі:

*Офіснаму клеркру*
*Родная прырода*
*На пачатку лета*
*Прычыніла шкоду:*
*Засвярбела ў носе,*
*Набрынялі вочы,*
*Алергена носьбіт —*
*Жоўценькі пылочак.*

Трэба разумець, якраз ад яго, лятучага, той клерк і сам бароніцца з дапамогай процівагаза, і (на думку **спадара Міколы Кісяля з Мінска**) іншым прапануе:

*Той, хто любіць пахі лета,*
*Ды хвароб баіцца,*
*Хай запомніць, што вось гэтак*
*Можна бараніцца:*
*Усцягнуў процівагаз*
*І гуляй, як дзікабраз.*

У тэму тут і радкі **спадарыні Валянціны Гудачковай з Жыткавічаў:**

*Паглядзіце, ягамосці, —*
*Гэта з будучыні госці...*
*Стрэнеш недзе*
*ды сам-насам, —*
*Каб не стаў заікам часам.*

Перад чым? Тое вядома **спадарыні Любові Чыгрынавай з Мінска:**

*Ясь знайшоў процівагаз*
*На гарышчы у дзядулі,*
*Прымярае ў першы раз:*
*Хутка ў войска... Там не гулі.*
*І ў салдаты, не у сваты:*
*Не завэшы: «Не пайду!»...*
*А надумаеш хавацца,*
*Дык пад рукі павядуць.*

Зрэшты, можа, і сам папросіцца — як адзін студэнт: прыйшоў ён на першую пару — не тое ў політэхнічны, не тое ў радыё-, пад дыктоўку выкладчыка запісаў тэму заняткаў: «Рэчаіснае функцыя камплексная пераменнай. Сюр'ектыўныя, ін'ектыўныя і біяктыўныя функцыі» — і адразу ж на тэлефон: «Алё, ваенкамат? Я перадумаў. Калі ў вас можна прайсці медкамісію?»

Трэба разумець, захацеў хлапчына служыць. Чым гэта можа абярнуцца, убачыла на здымку **спадарыня Гудачкова:**

*Навабранцы быў прыказ*
*Берагчы процівагаз!*
*Захаваў у час вучэнняў!*
*Ды... згубілася адзенне.*

Што на беразе раскі ды ў такой вось высокай траве, мякка кажучы, небяспечна.

Чым канкрэтна, — ведае **спадарыня Чыгрынава.** Яна ж — не тое просіць, не тое засцерагае:

*Не хадзіў бы ты, сынок,*
*Тут без ботаў і парток:*
*У трусы «нырне» вужака*
*І... мужчына ты — ніякі.*

Дарэчы, пра мужчын (пра іх — як кажуць жанкі — любой часіной дарэчы)... І таму

*Каля рэчкі, каля ваг*
*Свайго любага пазнаю:*
*У яго трусы малыя,*
*Ножкі тонкія, худыя,* —

піша **спадарыня Галіна Пятроўская са Смаргоншчыны,** неяк «не заўважыўшы», процівагаз на твары. З таго ж канверта яшчэ восем залікваўскіх радкоў:

*Лета, рэчка, сенажаць —*
*Анямелая...*
*Клічу дзевак паляжаць,*
*Калі... смелыя.*

Калі не? Калі доўга альбо і зусім не ідзе тая адна-адзіная, тады ўжо іншая карціна, іншы і настрой:

*Свеціць сонца на ўсё неба,*
*Сэрца — птушкай у грудзях...*
*Мяне мілка разлюбіла —*
*Утаплюся у слязах.*

А значыць, сам хлапчына іх пралівае (процівагаз на твары, каб гэтай слабіны нябачна было)... Ці ўсё ж не сам, а (паводле **спадарыні Чыгрынавай**)... яго крэдыторы да рэчкі «давялі» (ці, можа, і да ручкі):

*Не пабіла грады градам,*
*Не пужаў нажом бандыт...*
*Ясь застаўся з голым задам*
*Праз далярвы крэдыт.*

І тут вось што крыўдна, па-прыздраўску чалавека: ён у банку быў, абмяркоўваў умовы крэдытавання, калі дзверы там расчыніліся і трое з пісталетамі ў гвалт: «Стаяць!.. Гэта рабаванне!» — «Ды я вядаю, — адказаў ім Ясь. — Але ж цешча ўсе вантробы ад'ела: «Бяры крэдыт...», ды «Бяры крэдыт...», «Будуй жыллё» ды «Будуй...»

Трэба разумець, «дабудаваўся» чалавека: у палях ад крэдытораў хавалецца. А можа — як лічыць **спадар Сімянёнак** — тут зусім іншы варыянт, з рубрыкі «Крымінальная хроніка»? То-бок «пашчасціла» хлопцу дзеўку сустрэць, з якой так хораша ўсё пачынала: падабрала, абагрэла... А ўрэшце — абабрала і выгнала. Гэта — калі апісваць прозаічным радком, калі паэтычным...

*Над купальскаю вадой*
*Пазнаваты ранкам*
*Топча жоўты зверабой*
*Голы-босы Янка.*

*Страціў розум ён і твар,*
*Да любошчаў падкі...*
*Не дапяў — у дзеўкі дар*
*Яшчэ той махляркі!*

Між іншым, можа ён і ў хлопцаў быць. А вось які?

«Гадоў колькі таму ў адной з гарадскіх кватэр «парвала» трубу ацяплення, — успамінае **спадар Мікалай Старых з Гомеля.** — Сантэхнікі прыехалі на ліквідацыю аварыі. Дзверы адчынілі і як не рухнулі: кватэра (амаль да столі!) была завалена розным бярахлом. А паколькі яно яшчэ і намокла... Іншага выйсця не было: пад вокны падагналі трактар, у прычэп паскідалі ўсё «дабро» і вывезлі на сметнік. Так што жывы Курылка!» — сцвярджае шаноўны Мікалай Валянцінавіч. Ад яго ж:

*Ля рэкі на гэты раз*
*Ясь знайшоў... процівагаз*
*І на кумпал свой надзеў...*
*Да сябе кіруе ў хлеў...*
*Кажа: «Усякая драбніца*
*Калі-небудзь дзе згадзіцца...»*
*Ну а я зрабіў выснову:*
*Перад намі Плюшкін новы.*

«А вось і не, зусім не!» — упэўнены **сумэнцы Астроўскія**:

*Спорту ў нас даўно пашана:*
*Дайвінг — любы для Івана.*
*І на шчасце юнака*
*Ёсць празрыстая рака.*
*Там нырае ён заўзята.*
*То адзін, то разам з братам.*
*Чэмпіёнам хутка стане.*
*Мы — упэўнены ў Іване!*

А **спадарыня Любоў Чыгрынава** «ківае» між тым на... Пятра, лічыць, што ён такі скарыстаўся сэлфі-палкай, якую тры гады таму жонка падарыла на 23 лютага: дастаў ёю трусы, што завалілося за пральную машыну, і нават у іх прыбраўся, а потым

*Бачу, у нас на сэлфі мода?*
*Вырашыў праславіцца:*
*Хтось «нанёс» тату з нагоды,*
*Ён у «масцы» плавіцца.*

І каб толькі:

*Закарцела-такі Пецю*
*«Засвяціцца» ў інтэрнэце,*
*Дык на твар у гэты раз*
*Нацягнуў процівагаз.*

Карацей, чым бы дзіця ні цешылася... А бацькі пазіраюць ды ціхую гамонку вядуць: «Не ўяўляю, як мы будзем яго ад грудзей адлучаць?» — «Ну як?.. Скажам: «Сынок, ты ўжо вялікі, табе ў войска пара, мама з табой пайсці не можа»...

А таму напрыканцы — заклік ад **спадарыні Пятроўскай:**

*У анлайнах, выбачайце,*
*Годзе, хлопчыкі, сядзець:*
*Болей грошай зарабляйце —*
*Жонкі знойдуць, дзе іх дзець!*

(Размова дваіх: «Дарагая, калі нашы зберажэнні скласці разам, атрымаецца вялікая кучка?» — «Атрымаецца ямка»).

Вось на гэтай не вельмі вясёлай ноце і можна было б завяршыць чарговы агляд, калі б не трэ было падводзіць вынікі...

Такім чынам, на думку вялікага чытацкага журы, найлепшыя радкі пра два боты і аўтобус, пакінутыя некім у лесе (гл. нумар «Звязды» за 22 чэрвеня), склалі **спадарыні Любоў Чыгрынава з Мінска, Наталля Шкут са Светлагоршчыны, Валянціна Гудачкова з Жыткавічаў, Карына Цануніна з Вілейкі, спадары Мікалай Старых з Гомеля, Валерый Гаўрыш з Чавусаў і Мікалай Касмачэўскі....**

З гэтым вось, апошнім меркаваннем, пагадзілася і журы маленькае рэдакцыйнае. Таму прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцам газету на чацвёрты квартал 2019 года накіроўваецца ў **Навапалацк.**

Хочаце, каб «Звязда» прыходзіла і да вас? Як той казаў, не пытанне: афармляйце падпіску, альбо, ўважліва паглядзеўшы на новы конкурсны здымак, тварыце! То-бок прыдумвайце кароткі (не больш за восем радкоў) подпіс (а можна і некалькі...), дасылайце ў рэдакцыю.

Шанц на выйгрыш мае кожны.

**Валянціна ДОЎНАР.**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

АД ІХ ЖА шчырыя прабачэнні ўсім, чые радкі не прайшлі строгага адбору, не трапілі на старонкі газеты — гэтым разам. Затое наступным...

Пішыце!

# Якія сны сняцца айчыннаму экспарцёру?

## Карэспандэнт «Звязды» гутарыць з генеральным дырэктарам

## Беларускага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства экспартна-імпартнага страхавання «Белэксімгарант» Генадзем МІЦКЕВІЧАМ

У пачатку нашай сустрэчы Генадзь Антонавіч расказаў пра нараду ў Міністэрстве замежных спраў з удзелам першага намесніка прэм'ер-міністра Аляксандра Турчына і паслоў Беларусі за мяжой. Разглядалі пытанні аб выкананні даведзеных на пражыты перыяд года экспартных паказчыкаў па рэгіёнах. Сітуацыя няпростая, экспарт у параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года крыху «прасеў», на што ёсць як аб'ектыўныя, так і суб'ектыўныя прычыны.

Праўда, маюцца і добрыя прыклады — у некага экспарт вырас ледзьве не ў разы. Цудоўныя экспартныя кантракты, напрыклад, у нашага БелАЗа, у Беларускага металургічнага завода (БМЗ) паслі мадэрнізацыі і ўстаноўкі новага абсталявання.

— У ліку механізмаў па садзейнічанні прасоўванню нацыянальных тавараў за мяжу — фінансавыя, — падкрэслівае Генадзь Антонавіч, — а адным з ключавых фінансавых інструтуаў з'яўляецца нацыянальнае экспартна-імпартнае агенцтва «Белэксімгарант», створанае ў 2001 годзе пастановай урада. Сёння яно выкарыстоўвае ўсе напрацаваныя ў міжнароднай практыцы і дазволеныя міжнароднай супольнасцю, у тым ліку СГА (ВТО), незабароненыя субсідыі. Інакш кажучы — дазволеныя дзяржавай субсідыі для прасоўвання экспарту. Белэксімгарант даўно пазнавальны ўжо і на міжнароднай арэне: раней мы былі назіральнікамі ў Бернскім саюзе, яго Пражскім клубе, а тры гады таму сталі паўнавартаснымі членамі гэтага міжнароднага саюза страхаўшчыкоў крэдытаў і інвестыцый, які аб'ядноўвае больш за 80 экспартна-імпартных агенцтваў свету і з якімі ў нас заключана каля 35 двухбаковых пагадненняў аб супрацоўніцтве. На падыходзе яшчэ адно падпісанне пагадненя, гэтым разам з самым старым экспартным крэдытным агенцтвам, якое называецца крышку нязвыкла для нас: Дэпартамент гандлёвага фінансавання Вялікабрытаніі. Таксама дзяржаўны інстытут. У свой час гэта было самае першае экспартнае крэдытнае агенцтва ў свеце, яму цяпер сто гадоў. А нам *(усміхаецца)* толькі 18, мы нядаўна адзначылі паўналецце.

Але тым не менш у нашага маладога страхавога агенцтва ёсць свая гісторыя, маем што расказаць, і нават накоплены пэўны досвед. Калі аглядваешся назад, то разумееш: пройдзены няпросты шлях, і ёсць чым ганарыцца.

***— Што за гэтыя 18 гадоў было найбольш складаным?***

— Паколькі я таксама меў гонар стаяць каля вытокаў новага фінансавага інстытута, нават сістэмы дзяржаўнага страхавання экспартных рызык, і быў у ліку нямногіх, то з пэўнасцю магу ўспомніць тыя гады. Самым складаным было пераканаць некаторыя дзяржаўныя ўстановы ў неабходнасці стварэння новага фінансавага інстытута і што для Беларусі гэта надзвычай важна.

Рэспубліка Беларусь заўсёды лічылася (і была) экспартарыентаванай, бо з'яўлялася зборачным цэхам Савецкага Саюза. А інстытута страхавання экспартных аперацый краіны постсавецкай прасторы на той час не мелі, і толькі ў краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы такія інстытуты пачалі ствараць пасля распаду сацлагера. Ім дапамагаў Еўразасюз, нам дапамагаць не было каму. Мы гэты механізм вывучалі самі, уступілі ў кантакт з замежнымі экспартнымі крэдытнымі агенцтвамі — найбліжэйшымі суседзямі: польскім KUKE, EGAP з Чэхіі. Дзякуй ім, яны не адмовілі ў дапамозе. Мы вывучалі вопыт і іншых кампаній і разам з Міністэрствам фінансаў выйшлі з прапановай ва ўрад. Нас падтрымалі.

Даручэнне па стварэнні механізма падтрымкі экспарту было закладзена ў першай нацыянальнай праграме развіцця экспарту на 2000—2005 гады, якую ўхваліў кіраўнік краіны. Адчуваючы падтрымку, пачалі распрацоўваць на заканадаўчай аснове і з улікам замежнага вопыту канкрэтныя прапановы па стварэнні не проста новай страхавой арганізацыі, а новай сістэмы страхавання — менавіта экспарту. У 2006 годзе кіраўнік дзяржавы прыняў прапанову ўрада і падпісаў указ «Аб садзейнічанні развіццю экспарту тавараў (работ і паслуг)» № 354, які ўступіў у дзеянне з 1 студзеня 2007 года. Указам прадугледжана, што выключнае права на правядзенне аперацый па страхаванні экспартных рызык з падтрымкай дзяржавы належыць Рэспубліцы Беларусь і ад імя Рэспублікі Беларусь гэтая задача ўскладзена на Белэксімгарант.

З таго часу, за 11 гадоў, мы аказалі падтрымку нацыянальнаму экспарту ў аб'ёме больш чым шэсць мільярдаў долараў ЗША.

Але пачынаць заўсёды цяжка. На той час калектыў складаўся з чатырох спецыялістаў, сёння працуе каля пяцідзесят. Створаны сем буйных філіялаў, а таксама пункты продажу, у тым ліку на дзяржаўнай граніцы. У цэнтральным апараце ў нас працуе нямнога людзей, недзе каля 80 чалавек. Гэта стабільная колькасць, мы не пашыраем цэнтральны апарат, гэта наш штаб, які распрацоўвае стратэгію і канкрэтную тактыку работы, клапоціцца пра міжнароднае супрацоўніцтва, займаецца нарматворчасцю ў межах сваёй кампетэнцыі і гэтак далей.

І вось што яшчэ важна. Указ у першую чаргу паспрыяў нават не нам, ён даў інструмент нашым прадпрыемствам-экспарцёрам. Калі пастаўляецца прадукцыя за мяжу, то яны атрымалі магчымасць адтэрміноўкі плацяжу (для сваіх кліентаў) пад страхавое пакрыццё Белэксімгаранта. Гэта той інструмент, які вельмі блізкі па сваёй сутнасці да банкаўскага крэдытавання. Тыя ж самыя прынцыпы ў вывучэнні здзелак, крэдытаў, контрагента. Каб адну здзелку застраховаць, трэба праглядзець шмат дакументаў, шмат разнастайнай інфармацыі. Часам з'ездзіць разам з экспарцёрам пазнаёміцца з пакупніком — што ён з сябе ўяўляе. Бо здзелкі — мільённыя, а то і на дзясяткі мільёнаў долараў. Карацей, кожнай здзелцы папярэднічае вялікая андэрайтынгавая работа. Таму ў нас у структуры цэнтральнага апарату і ў філіялах ёсць людзі, якія прафесійна займаюцца гэтай карпатлівай работай, перш чым заключыць дагавор страхавання.

Я раней ужо гаварыў, — працягвае субяседнік, — што ўказ дзейнічае 11 гадоў, і за гэты час Белэксімгарант аказаў падтрымку нацыянальнаму экспарту больш чым на шэсць мільярдаў долараў ЗША. Гэта істотная лічба. Перада мной вынікі работы крэдытных агенцтваў Пражскага клуба Бернскага саюза за 2018 год. Тут пайменаваны 39 арганізацый (а ўсяго ў свеце іх больш за 80). За 2018 год мы сярод гэтых 39 знаходзімся на 9-й пазіцыі з аб'ёмам страхавога пакрыцця 765 мільёнаў долараў ЗША. Гэта значыць, увайшлі ў дзясятку найбольш моцных. Аляродзілі агенцтвы Грэцыі, Чэхіі (у каго вучыліся працаваць), Сербіі, Венгрыі, многія з якіх былі створаны раней за нас. І тэхнапазіцыю мы займаем штогод — у першай дзясятцы найбольш прасунутых кампаній.

***— Генадзь Антонавіч, а што сёння складана для генеральнага дырэктара, калектыву? Усё яшчэ складана ўгаворваць дырэктараў?***

— Угаворваць не трэба. Трэба прапаноўваць свае паслугі і паказваць перавагі гэтай сістэмы. Для гэтага мы, напрыклад, летась прымалі ўдзел у бізнес-курсе «Школа экспарцёра» Беларускай гандлёва-прамысловай палаты. Па гэтай праграме прайшлі навучанне кіраўнікі і спецыялісты беларускіх прадпрыемстваў, у тым ліку малога і прыватнага бізнесу, многа было людзей. Іх вучылі вядзенню знешнегандлёвага бізнесу. Як і раней, мы ўдзельнічаем у семінарах, сустрэчах, нарадах, якія праводзяць органы кіравання, мясцовыя ўлады, галіновыя міністэрствы, канцэрны. Тлумачым там перавагі нашай сістэмы пастаянна.

Калі прадпрыемства-экспарцёр працуе па папярэдняй аплаце, гэты механізм яму не патрэбны. Але так рэдка хто працуе, у асноўным гэта асобныя віды тавараў. А калі размова ідзе пра пастаўкі інавацыйнага абсталявання ці прадукцыі з высокай дабаўленай вартасцю, будаўнічай тэхнікі і абсталявання, то там адтэрміноўка плацяжу дасягае ад пяці да дзесяці гадоў. Прычына такога бонуса — сусветная канкурэнцыя. Хто прапануе найлепшыя ўмовы кантракта, той і пераможа ў конкурсе. І адна з такіх найпершых умоў — магчымасць значнай адтэрміноўкі. Дабаўлю ад сябе: якую варта застраховаць.

***— Калі коратка патлумачыць сітуацыю са страхаваннем знешнеэканамічных здзелак, то...***

— Калі параўноўваць з работай нашых замежных калег, то наш аб'ём пакрыцця экспарту знаходзіцца на тым жа сярэднім узроўні, які склаўся і ў іншых краінах. І гэта прыстойны ўзровень. Мы вышлі на той аб'ём страхавання, які я вам назваў, — шэсць мільярдаў за ўсе гэтыя гады. Летась лічба перавысіла 760 мільёнаў долараў. Гэта таксама прыстойны аб'ём. І ў нас ёсць магчымасці для нарошчвання аб'ёмаў. Усё залежыць ад прадпрыемстваў-экспарцёраў.

***— Пытанне ў тэму. Я чыста па-чалавечы разважаю: гэта ж проста — купіць у Белэксімгаранта страхавы поліс і спакойна адгрузіць прадукцыю на экспарт. Разлічацца ці не разлічацца — Белэксімгарант верне страты!***

— Правільна вы кажаце. Шэраг прадпрыемстваў так з намі і працуе. Але ж... ведаеце, увогуле гэта сур'ёзная праблема. Калі прадпрыемства-экспарцёр толькам не ведае свайго контрагента (пакупніка прадукцыі) і працуе з ім на адтэрміноўцы аплаты, вынік можа быць адзін — запазычанасць. Не першы год у краіне знешнюю дэбіторскую запазычанасць спрабуюць знізіць. На жаль, лічба запазычанасці вельмі вялікая, яе агучвалі і генеральны пракурор, і на ўзроўні ўрада. Стаіць задача па яе зніжэнні. І адзін з механізмаў для гэтага, ён прапануецца і ўрадавымі органамі, — выкарыстанне магчымасцяў, якія дадзены Указам № 534.

З нашым удзелам менавіта гэтая схема і працуе. Мы ўсебакова вывучаем контрагента, аналізуем сам кантракт, наколькі ён рэальны, ці не падман гэта. Я вам раней расказваў — былі выпадкі, калі фірмы-аднадзёнкі жульніцкім шляхам спрабавалі завалодаць экспартным таварам, і ніякай аплаты не было б. Вось чаму з нашага боку праводзіцца дасканалы андэррайтынг усёй схемы кожнай здзелкі, якую нам трэба страхаваць. У тым ліку вывучаецца нават рэпутацыя атрымальніка тавару. Мы запрошваем балансы, іншую бухгалтарскую справаздачнасць, наогул карысную інфармацыю пра яго. І наш больш чым дзесяцігадовы вопыт сведчыць, што прадпрыемствы, якія з намі працуюць, выходзяць з простай логікі і хочуць засцерагчы ад рэальнай небяспекі сябе і свой бізнес. Бо калі замежны партнёр падвядзе, прадпрыемства-экспарцёр усё роўна свае грошы атрымае. Прытым сродкі на страхаванне можна аднесці на сабекошт, гэта звычайная нармальная практыка.

***—У апошні час сітуацыя на знешніх рынках не стала больш складанай? Бо нявызброеным вокам бачна, што ўзрасліпалітычныя рызыкі.***

— У гэтай сітуацыі мы працуем па схеме, прадугледжанай спецыяльнымі рашэннямі па дыверсіфікацыі экспарту. Ёсць такая формула: адна траціна экспарту павінна адпрацьляцца на краіны Еўразійскага эканамічнага саюза (ЕАЭС), яшчэ адна — на краіны Еўрасаюза, і адна на краіны астатняга свету, так званай «дальняй дугі». Прычым будзем мець на ўвазе, што карта экспартных паставак працягвае пашырацца. Мы працуем у гэтым кірунку з нашымі галіновымі міністэрствамі і канцэрнамі. З'яўляюцца новыя краіны, куды ідзём дастаткова смела разам з нашымі прадпрыемствамі. Той жа Егіпет, і Бангладэш, куды пастаўляецца беларуская тэхніка, і іншыя напрамкі. Сёння ў нас геаграфія краін, дзе мы прысутнічаем разам з айчыннымі пастаўшчыкамі, перавысіла лічбу 60. Безумоўна, лідзіруючае становішча займаюць краіны ЕАЭС — Расія, Казахстан, астатнія краіны СНД. Украіна. Узрастае доля краін Еўрасаюза і «дальняй дугі». Тут таксама аб'ёмы растуць.

Рызыкі сапраўды павялічваюцца, і мы ўвесь час шукаем тыя эфектыўныя механізмы, якія магчыма выкарыстаць у выпадку надыходу страхавых падзей з мэтай вяртання валютнай выручкі. А ў кожным канкрэтным выпадку яны могуць быць розныя. Напрыклад, гэта атрыманне гарантый замежных банкаў ці нават гарантый урадаў і органаў мясцовай улады. Альбо буйных плацежаздольных суб'ектаў гаспадарання. Без гэтага мы ў краіны з высокімі рызыкамі не ідзём, без такога забеспячэння. Забеспячэнне павінна быць, так дыктуе сусветная практыка работы экспартных крэдытных агенцтваў.

На знешніх рынках, асабліва новых, заўсёды працаваць складана, але ў нас ёсць магчымасць актыўнага супрацоўніцтва з калегамі — экспартна-крэдытнымі агенцтвамі — членамі Бернскага саюза. Мы многае ўдакладняем у іх, у тым ліку іх асабісты досвед работы з тымі ці іншымі краінамі, і гэта цудоўная пляцоўка для ўзаемадзеяння і прасоўвання на новыя рынкі. Цяпер мы стварылі такую новую пляцоўку ў рамках ЕАЭС, якому сёлета спаўняецца пяць гадоў. Стварылі рабочую групу крэдытных агенцтваў, куды ўвайшлі расійскае экспартнае агенцтва ЭКСАР, экспартныя агенцтвы з Казахстана і Арменіі і мы. У Кыргызстане пакуль няма свайго экспартнага агенцтва. Прынялі мемарандум аб супрацоўніцтве, вызначылі крокі па ўніфікацыі нашых умоў падтрымкі экспарту — умоў страхавання, заключылі двухбаковыя пагадненні паміж нашымі кампаніямі па супрацоўніцтве і па пытаннях перастрахавання, ёсць ужо канкрэтныя здзелкі, якія мы праводзім сумесна.

Абсалютна новы кірунак работы — страхавая падтрымка інвестыцыйных праектаў, што разлізуюцца ў Рэспубліцы Беларусь, але экспартарыентаваныя.

Свае страхавыя прадукты мы прапануем трэцім краінам, якія цікавіць Рэспубліка Беларусь з пункту погляду ўкладання інвестыцый, іх цікавіць ступень абароненасці здзелак, іх страхавое забеспячэнне. Але з боку ўрада такое забеспячэнне атрымаць няпроста, таму Белэксімгарант як агент урада прапануе ўласныя механізмы забеспячэння праз страхаванне. Для прыкладу: будаўніцтва Мёрскага металургічнага завода па выторвачсці бляхі. Укладанні ў яго ўзвядзенне вельмі вялікія — гэта і крэдыты еўрапейскія, у прыватнасці нямецкія, расійскія, беларускія. Тут задзейнічаны банкі і экспартна-крэдытныя агенцтвы гэтых краін, у тым ліку і мы. Калі б не было такой падтрымкі фінансавых інстытутаў, праект наўрад ці змог бы рэалізавацца.

***— Вы па-ранейшаму сярод лідараў беларускага страхавога рынка?***

— Гэтая пазіцыя застаецца, у пяцёрку найбуйнейшых страхавых кампаній мы ўвайшлі ўжо даўно, па мінулым годзе пацвердзілі яе яшчэ раз. Скажам, па аб'ёме сабранай страхавой прэміі мы ў першай пяцёрцы. Па статутным капітале — на першым месцы сярод страхавых кампаній. Трэба адзначыць, што Белэксімгарант заўсёды працуе з прыбыткам і добрай рэнтабельнасцю. Гэта да пытання аб эфектыўнасці фінансава-гаспадарчай дзейнасці Белэксімгаранта.

Сваю нішу мы занялі надзейна. Штогод прысвойваецца рэйтынг фінансавай устойлівасці ад Fitch Ratings, гэта адно з трох аснoўных рэйтынгавых агенцтваў, якое ўстанаўлівае суверэнныя рэйтынгі банкам, страхавым кампаніям. І ніжэй за рэйтынг краіны (краінавы суверэнны рэйтынг) мы ніколі не апускаліся.

***— Ці з'явіліся новыя віды страхавых паслуг за апошні час?***

— У сувязі з будаўніцтвам Беларускай АЭС, якое знаходзіцца на завяршальнай стадыі, уступае ў дзеянне міжнародная канвенцыя аб так званай ядзернай шкодзе. Канвенцыя абавязвае краіны, на тэрыторыі якіх ёсць атамныя станцыі, прытрымлівацца міжнародных правіл эксплуатацыі, каб мінімізаваць страты ў выніку нейкіх непрадбачаных падзей. Сёлета, у студзені 2019 года, быў прыняты Указ Прэзідэнта № 15 «Аб адказнасці за ядзерны ўрон». Грунтуючыся на гэтым указе, у Беларусі быў сфарміраваны Беларускі ядзерны страхавы пул, у які ўвайшлі тры буйныя страхавыя кампаніі — Белдзяржстрах, Белэксімгарант і Беларускае нацыянальнае перастраховачнае таварыства. Намі распрацаваны адпаведныя ўмовы, правілы, і вось гэтая сістэма страхавання абсалютна новая для Рэспублікі Беларусь.

***— Каб паспяхова выконваць такі вялізарны аб'ём складанай, адказнай работы, патрэбна каманда...***

— Каманда ёсць, у калектыве сплаў вопыту і маладой энергіі. Вядуцца пастаянны падбор кадраў, іх навучанне і павышэнне кваліфікацыі, стажыроўкі за мяжой. Цесна ўзаемадзейнічаем з нашай вядучай эканамічнай ВНУ — Беларускім эканамічным універсітэтам. У нас праходзяць практыку юрысты, па выніках адбіраем найлепшых.

Практыкуем і новыя формы работы са свайі моладдзю. У чэрвені ў нас адбылася сустрэча, у якой удзельнічалі маладыя спецыялісты нашай сістэмы з Расіі, Арменіі, Казахстана, Беларусі. Я адкрываў сустрэчу, паглядзеў, якая прафесійна моцная моладзь прыйшла ў сістэму. Яны тонка адчуваюць усе эканамічныя працэсы, юрыдычныя нюансы, успрымаюць карысныя для сябе досвед як тая губка. І нашым было чаму ў іх павучыць ца і падзялілца сваім вопытам.

І не забываем пра сваіх ветэранаў. Калі чарговы раз перазалючылі калектыўны дагавор паміж наймальнікам і калектывам, інтарэсы якога абараняе наша прафсаюзная арганізацыя, то адным з яго раздзелаў, як заўсёды, запісалі ўсебаковую падтрымку нашым ветэранам. Яны ў нас застаюцца ў цэнтры ўвагі. Заўсёды запрашаем іх на свае мерапрыемствы. Выходзім з таго, што пакуль у калектыве ёсць памяць пра тое шлях, які ён прайшоў, арганізацыя будзе стабільна працаваць. І свайго былога генеральнага дырэктара, адзнача са стваральнікаў сістэмы Вячаслава Дзмітрыевіча Балібока, канешне ж, клічам, ён у нас вельмі актыўны. Прычым не толькі ў нас, але і наогул на страхавым рынку. І ўдзельнічае ў рабоце нашага грамадскага саюза «Страхаванне Беларусі», выступае ў ім з артыкуламі, з карыснымі парадамі. Нядаўна ён адзначыў 70-годдзе, і мы цёпла яго павіншавалі.

***— Генадзь Антонавіч, якраз заўтра ў вас таксама знамянальная падзея — дзень нараджэння. Добрая нагода расказаць пра сябе.***

— Мінчанін. Пасля заканчэння школы працоўную біяграфію пачынаў вучнем слесара-інструментальшчыка на «Інтэргале». Далей — два гады службы ў паветраных сілах. Паступіў у наргас імя Куйбышава, пасля заканчэння трапіў на размеркаванні ў фінансавыя органы Віцебскай вобласці. Працаваў старшым кантралёрам-рэвізорам КРУ Міністэрства фінансаў Беларусі па Дубровенскім раёне. Спачатку даводзілася нялроста, бо такая пасада была адзіная ў райфо, затое набраўся вопыту.

Пасля Дуброўна мяне перавялі ў цэнтральны апарат Міністэрства фінансаў. Адтуль праз некаторы час перайшоў у Дзяржстрах Беларусі. І там рос ад рэвізора кантрольна-рэвізійнага ўпраўлення, намесніка начальніка ўпраўлення бухгалтарскага ўліку і кантролю да дырэктара дэпартамента страхавання Белдзяржстраха. А ў 1998 годзе жыццё зрабіла чарговы паварот: запрасілі працаваць у новую для краіны структуру — Беларускую дзяржаўную страхавую арганізацыю па страхаванні рызык, звязаных са знешнеэканамічнай дзейнасці (Белдзяржзнешстрах) першым намеснікам дырэктара. Пазней, у 2001 годзе, арганізацыя была перайменавана ў Беларускае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства экспартна-імпартнага страхавання «Белэксімгарант» (заснавальнік — урад Рэспублікі Беларусь), працягваў працаваць першым намеснікам генеральнага дырэктара. А калі ў 2009 годзе В. Д. Балібок выйшаў на заслужаны адпачынак, прызначаны генеральным дырэктарам.

Пасада не простая, работа не лёгкая, але ў страхавых органах я больш за 30 гадоў, і настаўнікі былі моцныя. Вучылі працаваць сістэмна — як у каманде, так і самастойна. А таксама засвойваць новыя кірункі ў сферы сваёй кампетэнцыі, вырашаць пытанні канкрэтна і па сутнасці.

***— У характарыстыцы, падпісанай яшчэ ў 2014 годзе У. В. Амарыным, тады яшчэ першым намеснікам міністра фінансаў, пазней міністрам фінансаў Рэспублікі Беларусь, так і сказана: «Не баіцца браць на сябе адказнасць, у складаных сітуацыях не траціць самавалодання, знаходзіць, як правіла, аптымальнае вырашэнне пытанняў».***

— Дзякуй Уладзіміру Віктаравічу і за добрыя словы, і за прафесійную школу, а таксама падтрымку ад яго і іншых кіраўнікоў Мінфіна.

Вы пытаецеся, ці адчуваю я задаволенасць ад пражытых гадоў. Чаму б і не? Работа выканна значная, я таксама стаяў каля вытокаў стварэння новай сістэмы страхавання ў краіне, якая дае шанц экспарцёру адчуваць сябе ўпэўнена. У выпадку чаго на дапамогу прыйдзе Белэксімгарант. І дапамога гэтая будзе хуткая, надзейная і эфектыўная.

**Гутарыў**
**Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ.**
**Здымкі Белэксімгаранта.**

УНП 101421509

Спецыяльны дазвол (ліцэнзія) № 2200/13-00049 на права асыцыцыйнага страхавай дзейнасці. Выдадзены Міністэрствам фінансаў РБ 23 красавіка 2008 года.




**24 жніўня 2017 года ў Астане (Рэспубліка Казахстан) нацыянальныя экспартна-крэдытныя агенцтвы краін ЕАЭС падпісалі Мемарандум аб супрацоўніцтве ў прысутнасці віцэ-прэм'ераў краін Еўразійскага эканамічнага саюза.**

**Сплаў маладосці, вопыту і... спартыўнасці.**

## СЛОНІМСКІЙ РАЁННЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ паведамляе аб правядзенні адкрытага аўкцыёна з умовамі продажу аб'ектаў

**ПА ПРАДАЖЫ ЗЯМЕЛЬНЫХ УЧАСТКАЎ ВА ЎЛАСНАСЦЬ**

| № лота | Правовой рэжым | Месцазнаходжанне аб'екта | Плошча зямельнага ўчастка, га | Кадастровы нумар | Пачатковая цана продажу, руб. | Сума задатка, руб. | Стоимость затрат на оформление документации, руб. | Мэтавае прызначэнне зямельнага ўчастка | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | частная собственность земельного участка | г. Слоним, ул. Сосновая, 2Б | 0,0996 | 425450100001008659 | 9402,24 | 940,23 | 2169,22 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | |
| 2 | частная собственность земельного участка | г. Слоним, ул. Садовая, 41В | 0,0934 | 425450100001009158 | 8237,88 | 823,79 | 2090,47 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | |
| 3 | частная собственность земельного участка | г. Слоним, ул. Панасовка, 27 | 0,0965 | 425450100001009159 | 8511,30 | 851,13 | 2037,78 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | |

**ПА ПРАДАЖЫ ПРАВА АРЭНДЫ ЗЯМЕЛЬНЫХ УЧАСТКАЎ**

| № лота | Правовой рэжым | Месцазнаходжанне аб'екта | Плошча зямельнага ўчастка, га | Кадастровы нумар | Пачатковая цана продажу, руб. | Сума задатка, руб. | Стоимость затрат на оформление документации, руб. | Мэтавае прызначэнне зямельнага ўчастка | Тэрмін арэнды ўчастка |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Аренда земельного участка | г. Слоним, ул. Коссовский Тракт | 0,0875 | 425450100001008300 | 4349,73 | 434,97 | - | для строительства и обслуживания бесконтактной мойки | 20 лет |
| 2 | Аренда земельного участка | г. Слоним, ул. Адама Мицкевича | 0,1992 | 425450100001006733 | 14697,25 | 1469,73 | - | для строительства торгового павильона | 20 лет |
| 3 | Аренда земельного участка | г. Слоним, ул. Красных Партизан | 0,8177 | 425450100001007893 | 37015,32 | 3701,53 | - | для строительства и обслуживания торгового магазина | 10 лет |
| 4 | Аренда земельного участка | г. Слоним, ул. Подлесная, 39 | 0,3157 | 425450100001007261 | 14290,98 | 1429,10 | 68,42 | для строительства и обслуживания торгового объекта | 10 лет |
| 5 | Аренда земельного участка | г. Слоним, ул. Минский Тракт, 105А | 0,1283 | 425450100001007260 | 3894,57 | 398,45 | 61,82 | для строительства и обслуживания торгового объекта | 10 лет |
| 6 | Аренда земельного участка | г. Слоним, ул. Красноармейская | 0,4134 | 425450100001009154 | 26967,90 | 2696,79 | 2919,43 | для строительства объектов по ремонту и обслуживанию автомобилей с магазином | 20 лет |
| 7 | Аренда земельного участка | г. Слоним, ул. Пушкина | 1,0680 | 425450100001009155 | 25164,22 | 2516,42 | 3364,21 | для строительства объектов промышленности | 20 лет |
| 8 | Аренда земельного участка | г. Слоним, ул. Яна Купалы | 0,2230 | 425450100001009156 | 8623,28 | 862,33 | 2372,89 | для строительства объектов промышленности | 20 лет |
| 9 | Аренда земельного участка | г. Слоним, ул. Карла Маркса | 0,0618 | 425450100001009157 | 5664,64 | 566,46 | 2248,73 | для строительства торгового объекта (павильона) | 20 лет |
| 10 | Аренда земельного участка | г. Слоним, ул. Тополевая | 0,8840 | 425450100001009160 | 65222,76 | 6522,28 | 3051,48 | для строительства объекта бытового обслуживания | 20 лет |

**Умовы продажу аб'екта:**

1. Вяскоўе пабедзіцелем аўкцыёна стаімасці права часткі зямельнага ўчастка, платы за права заключэння дагавора арэнды зямельнага ўчастка, а таксама выдаткаў, звязаных з правядзеннем аўкцыёна, ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам.

3. Заключэнне пабедзіцелем аўкцыёна дагавора арэнды зямельнага ўчастка са Слонімскім раёнскім камітэтам архітэктуры і горадабудаўніцтва (скарочана – Слонімскі райкамгас) і рэгістрацыя права на зямельны ўчастак, дзяржаўная рэгістрацыя ўзнікнення ўстаноўленага сервітута (абмежавання) ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам.

4. Пратакол аб выніках аўкцыёна з'яўляецца падставай для заключэння дагавора арэнды зямельнага ўчастка, дакумент, які пацвярджае ўстаноўленае ў адпаведнасці з заканадаўствам права на зямельны ўчастак, дакумент, які пацвярджае ўстаноўленае ў адпаведнасці з заканадаўствам права на зямельны ўчастак.

5. Пабедзіцель аўкцыёна абавязаны ў 10-дзённы тэрмін з дня правядзення аўкцыёна кампенсаваць Слонімскаму райкамгасу выдаткі, звязаныя з падрыхтоўкай і правядзеннем аўкцыёна, у тым ліку выдаткі на апублікаванне інфармацыі аб правядзенні аўкцыёна, на падставе прадстаўленых Слонімскім райкамгасам дакументаў, якія пацвярджаюць гэтыя выдаткі.

6. Пабедзіцель аўкцыёна абавязаны ў 10-дзённы тэрмін з дня правядзення аўкцыёна кампенсаваць Слонімскаму райкамгасу выдаткі, звязаныя з падрыхтоўкай і правядзеннем аўкцыёна, на падставе прадстаўленых Слонімскім райкамгасам дакументаў, якія пацвярджаюць гэтыя выдаткі.

7. Пабедзіцель аўкцыёна абавязаны ў 10-дзённы тэрмін з дня правядзення аўкцыёна кампенсаваць Слонімскаму райкамгасу выдаткі, звязаныя з падрыхтоўкай і правядзеннем аўкцыёна, на падставе прадстаўленых Слонімскім райкамгасам дакументаў, якія пацвярджаюць гэтыя выдаткі.

8. Пабедзіцель аўкцыёна абавязаны ў 10-дзённы тэрмін з дня правядзення аўкцыёна кампенсаваць Слонімскаму райкамгасу выдаткі, звязаныя з падрыхтоўкай і правядзеннем аўкцыёна, на падставе прадстаўленых Слонімскім райкамгасам дакументаў, якія пацвярджаюць гэтыя выдаткі.

9. Пабедзіцель аўкцыёна абавязаны ў 10-дзённы тэрмін з дня правядзення аўкцыёна кампенсаваць Слонімскаму райкамгасу выдаткі, звязаныя з падрыхтоўкай і правядзеннем аўкцыёна, на падставе прадстаўленых Слонімскім райкамгасам дакументаў, якія пацвярджаюць гэтыя выдаткі.

10. Пабедзіцель аўкцыёна абавязаны ў 10-дзённы тэрмін з дня правядзення аўкцыёна кампенсаваць Слонімскаму райкамгасу выдаткі, звязаныя з падрыхтоўкай і правядзеннем аўкцыёна, на падставе прадстаўленых Слонімскім райкамгасам дакументаў, якія пацвярджаюць гэтыя выдаткі.

**Умовы продажу аб'екта:**

1. Вяскоўе пабедзіцелем аўкцыёна стаімасці права часткі зямельнага ўчастка, платы за права заключэння дагавора арэнды зямельнага ўчастка, а таксама выдаткаў, звязаных з правядзеннем аўкцыёна, ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам.

2. Вяскоўе пабедзіцелем аўкцыёна расходаў, звязаных з правядзеннем аўкцыёна і афармленнем зямельнага ўчастка, а таксама дзяржаўнай рэгістрацыяй ўзнікнення ўстаноўленага сервітута (абмежавання) ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам.

3. Заключэнне пабедзіцелем аўкцыёна дагавора арэнды зямельнага ўчастка са Слонімскім раёнскім камітэтам архітэктуры і горадабудаўніцтва (скарочана – Слонімскі райкамгас) і рэгістрацыя права на зямельны ўчастак.

4. Пратакол аб выніках аўкцыёна з'яўляецца падставай для заключэння дагавора арэнды зямельнага ўчастка, дакумент, які пацвярджае ўстаноўленае ў адпаведнасці з заканадаўствам права на зямельны ўчастак, дакумент, які пацвярджае ўстаноўленае ў адпаведнасці з заканадаўствам права на зямельны ўчастак.

5. Пабедзіцель аўкцыёна абавязаны ў 10-дзённы тэрмін з дня правядзення аўкцыёна кампенсаваць Слонімскаму райкамгасу выдаткі, звязаныя з падрыхтоўкай і правядзеннем аўкцыёна, на падставе прадстаўленых Слонімскім райкамгасам дакументаў, якія пацвярджаюць гэтыя выдаткі.

6. Пабедзіцель аўкцыёна абавязаны ў 10-дзённы тэрмін з дня правядзення аўкцыёна кампенсаваць Слонімскаму райкамгасу выдаткі, звязаныя з падрыхтоўкай і правядзеннем аўкцыёна, на падставе прадстаўленых Слонімскім райкамгасам дакументаў, якія пацвярджаюць гэтыя выдаткі.

7. Пабедзіцель аўкцыёна абавязаны ў 10-дзённы тэрмін з дня правядзення аўкцыёна кампенсаваць Слонімскаму райкамгасу выдаткі, звязаныя з падрыхтоўкай і правядзеннем аўкцыёна, на падставе прадстаўленых Слонімскім райкамгасам дакументаў, якія пацвярджаюць гэтыя выдаткі.

8. Пабедзіцель аўкцыёна абавязаны ў 10-дзённы тэрмін з дня правядзення аўкцыёна кампенсаваць Слонімскаму райкамгасу выдаткі, звязаныя з падрыхтоўкай і правядзеннем аўкцыёна, на падставе прадстаўленых Слонімскім райкамгасам дакументаў, якія пацвярджаюць гэтыя выдаткі.

9. Пабедзіцель аўкцыёна абавязаны ў 10-дзённы тэрмін з дня правядзення аўкцыёна кампенсаваць Слонімскаму райкамгасу выдаткі, звязаныя з падрыхтоўкай і правядзеннем аўкцыёна, на падставе прадстаўленых Слонімскім райкамгасам дакументаў, якія пацвярджаюць гэтыя выдаткі.

10. Пабедзіцель аўкцыёна абавязаны ў 10-дзённы тэрмін з дня правядзення аўкцыёна кампенсаваць Слонімскаму райкамгасу выдаткі, звязаныя з падрыхтоўкай і правядзеннем аўкцыёна, на падставе прадстаўленых Слонімскім райкамгасам дакументаў, якія пацвярджаюць гэтыя выдаткі.

**Умовы продажу аб'екта:**

1. Вяскоўе пабедзіцелем аўкцыёна стаімасці права часткі зямельнага ўчастка, платы за права заключэння дагавора арэнды зямельнага ўчастка, а таксама выдаткаў, звязаных з правядзеннем аўкцыёна, ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам.

2. Вяскоўе пабедзіцелем аўкцыёна расходаў, звязаных з правядзеннем аўкцыёна і афармленнем зямельнага ўчастка, а таксама дзяржаўнай рэгістрацыяй ўзнікнення ўстаноўленага сервітута (абмежавання) ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам.

3. Заключэнне пабедзіцелем аўкцыёна дагавора арэнды зямельнага ўчастка са Слонімскім раёнскім камітэтам архітэктуры і горадабудаўніцтва (скарочана – Слонімскі райкамгас) і рэгістрацыя права на зямельны ўчастак, дзяржаўная рэгістрацыя ўзнікнення ўстаноўленага сервітута (абмежавання) ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам

НАВІГАТАР

Тэхналогіі

# Як выдаліць пластык з Сусветнага акіяна

**Штогод чалавецтва выкідвае ў акіян да 14 мільёнаў тон пластыка, 40 % з якога лічыцца «свежым». Гэта значыць, ён трапляе ў ваду на працягу таго ж года, у які і быў выраблены.**

Калі вас не палохае гэтая лічба, то вось вам просты прыклад: у акіяне больш кавалкаў пластыку, чым зорак у галактыцы Млечны Шлях. Пры гэтым вяліказ частка гэтага пластыку наогул не з'яўляецца біярасладальнай ці расладаецца вельмі дрэнна: у сярэднім пластык раскладаецца ад 100 да 1000 гадоў. І гэта сапраўдная праблема, бо ён ужо выклікае гібель мноства насельнікаў мораў і акіянаў. Аднак у навукоўцаў, здаецца, ёсць рашэнне гэтай праблемы, піша hi-news.ru.

Каб паменшыць колькасць пластыку ў акіяне, для пачатку трэба было б абмежаваць яго вытворчасць, наладзіць утылізацыю і пачаць выкарыстоўваць біярасладальныя і бясшкодныя для прыроды віды гэтага матэрыялу. Але што рабіць з той празмернай колькасцю пластыку, якая ўжо знаходзіцца ў сусветным акіяне? У новым даследаванні, апублікаваным у часопісе Matter, навукоўцы апісваюць новы тып тэхналогіі, якая магла б дапамагчы: маленькія магнітныя «нанашпулькі», якія з'яўляюцца каталізатарамі хімічных рэакцый, здольных расшчапляць пластык. Прычым не на шкодныя кампаненты, як, напрыклад, пры спальванні, а на вугляксілы газ і ваду.

Самі металічныя шпулькі пакрытыя азотам і марганцам. Гэтыя два хімічныя элементы ўзаемадзейнічаюць з нанашпулькамі і стваряюць высокаактыўныя малекулы кісларозу, якія, у сваю чаргу, «атакуюць» пластык. У выніку на выхадзе атрымліваюцца вугляксілы газ, вада і шэраг нейтральных соляў, бяскрыўдных для жывых арганізмаў.



Маленькія магнітныя шпулькі памерам менш за міліметр, здольныя разбураць мікрапластык.

Для праверкі работы сваёй вынаходкі навукоўцы дадалі нанашпулькі ва ўзоры вады, забрудненыя мікрапластыкам (вельмі дробныя часціцы пластыку), для таго каб працэс пайшоў хутчэй. У выніку за восем гадзін у розных узорах вады навукоўцы назіралі скарачэнне канцэнтрацыі мікрапластыку ў межах ад 30 да 50 %. Пры гэтым шпулькі лёгка здабываюцца з вады звычайным магнітам і іх, само сабой, можна выкарыстоўваць паўторна.

«Наша даследаванне ўсё яшчэ знаходзіцца на стадыі доказу жыццяздольнасці канцэпцыі, — заяўляюць навукоўцы. — Але ўжо на гэтым этапе мы можам казаць пра тое, што наш падыход працуе. Вядома, трэба пратэставаць шпулькі ў больш адпаведных умовах і больш дакладна вывучыць склад вады пасля стапрацэнтнага распаду пластыку. Але мы спадзяёмся, што нашы пошукі завершацца поспехам».

Хочацца дадаць, што бяскрыўдныя (са слоў навукоўцаў) солі, якія атрымліваюцца ў выніку ўздзеяння шпулек, сапраўды патрабуюць далейшага падрабязнага вывучэння. Бо нават калі яны не шкодныя самі па сабе (што, зноў жа, пакуль яшчэ не даказана), то яны могуць уступаць у злучэнні з іншымі рэчывамі і ўтвараць больш складаныя злучэнні, якія ўжо могуць уяўляць пагрозу.

З мінулага ў будучыню

# ШТО ЖУЛЬ ВЕРН ПРАДКАЗАЎ ДЛЯ НАШЧАДКАЎ

**Французскі пісьменнік Жуль Верн быў класікам прыгодніцкай літаратуры і адным з заснавальнікаў жанру навуковай фантастыкі. Паводле статыстыкі ЮНЕСКА, кнігі Жуля Верна займаюць другое месца ў свеце па колькасці перакладаў, саступаючы толькі творам Агаты Крысці. Летась споўнілася 190 гадоў з дня нараджэння гэтага сусветна вядомага пісьменніка. З героямі яго твораў адбываліся яркія і дзіўныя прыгоды, аднак такімі яны сталі менавіта таму, што іх аўтар стварыў у сваіх раманах неверагодныя машыны, якія мелі з'явіцца толькі ў будучыні. Паглядзім, якія ж фантастычныя рэчы прыдумаў ці прадказаў іх развіццё гэты вялікі пісьменнік.**

### КАСМІЧНЫЯ ПАЛЁТЫ

*Творы: «З гарматы на Месяц», «Вакол Месяца» і «Гектар Сервадак».*

У гэтых сваіх творах Жуль Верн «запусціў» міжпланетныя караблі з дапамогай гарматы. Але ён змог прадказаць не проста палёты ў космас і на Месяц, але яшчэ і пачатак шырокага даследавання (і вытворчасці) алюмінію для аэракасмічнай галіны, хоць у яго час гэты метал быў вельмі дарагі. Стартавай пляцоўкай для месяцовай экспедыцыі ён выбраў Стоўнз-Хіл у Фларыдзе. Гэта таксама вельмі цікава, таму што зусім побач знаходзіцца мыс Канаверал, дзе сёння размешчаны цалкам рэальны амерыканскі касмадром.

### ХУТКІЯ ПАДАРОЖЖЫ ВАКОЛ СВЕТУ

*Твор: «Вакол свету за 80 дзён».*

І тут фантастыка аказалася зусім недалёка ад ісціны. Герой рамана па імені Філеас Фог здзейсніў падарожжа вакол свету за 80 дзён. Сёння здзейсніць падарожжа вакол Зямлі можна за 70 гадзін. Дарэчы, журналістка Нэлі Блай аб'ехала Зямлю за 72 дні 6 гадзін 10 хвілін 11 секундаў яшчэ пры жыцці Жуля Верна. І па дарозе заехала да пісьменніка ў Ам'ен — засведчыць павагу.

### ПАДВОДНЫЯ ЛОДКІ

*Твор: «20 000 лье пад вадой».*

Першыя падводныя лодкі з'явіліся яшчэ да Верна, англійскі механік Карнеліус Дрэбель пабудаваў вясляную субмарыну яшчэ ў XVII стагоддзі, былі эксперыментатары і пасля. Аднак пісьменнік змог шмат у чым адгадаць, як яны будуць развівацца ў аглядны будучыні. Так, сусветна вядомы карабель капітана Нема «Наўцілус» мог развіваць хуткасць да 50 вузлоў, апускацца і даследаваць марское дно і праводзіць актыўныя ваенныя дзеянні.

### АКВАЛАНГ

*Твор: «20 000 лье пад вадой».*

Пісьменнік таксама шмат у чым прадказаў, як будуць развівацца вадалазныя касцюмы. На момант напісання рамана касцюмы для апускання пад ваду ўжо існавалі, аднак яны былі вельмі нязручныя і небяспечныя для вадалаза. Сучасны акваланг у 1943 годзе вынайдзе іншы вядомы француз — Жак-Ів Кусто.







### САМАЛЁТЫ І ВЕРТАЛЁТЫ

*Творы: «Уладар свету» і «Робур-Заваёўнік».*

Нароўні з іншым вядомым пісьменнікам Гербертам Уэлсам, Жуль Верн у сваіх творах змог прадказаць шырокае распаўсюджанне лятальных апаратаў. Пісьменнік таксама прадказаў, што авіяцыя будзе шырока выкарыстоўвацца ў войнах будучыні. Самалёт з пераменным вектарам цягі Верн апісаў у пачатку «Незвычайных прыгод экспедыцыі Барсака». Гэты твор, на жаль, пісьменнік не паспеў скончыць пры жыцці, кнігу дапісваў яго сын. Яна была апублікавана толькі ў 1914 годзе.

### ГІГАНЦКІЯ ПУШКІ І ХІМІЧНАЯ ЗБРОЯ

*Твор: «Пяцьсот мільёнаў бегумы».*

Апублікаваны ў 1879 годзе раман «Пяцьсот мільёнаў бегумы» апавядае пра супрацьстаянне доктара Франсуа Саразена і нямецкага прафесара-вар'ята Шульца, стваральніка гіганцкай гарматы, здольнай адпраўляць цяжкія снарады, начыненыя атрутным газам, на многія кілометры ўдалячынь. Падобная зброя насамрэч была ўжыта падчас Першай сусветнай вайны: адначасна Жуль Верн прадказаў і «нямецкую пагрозу», якая стала прычынай абедзвюх сусветных войнаў, а мілітарызаваны горад-крэпасць Штальштат, здаецца, быў ідэалам Гітлера. Пра Гітлера ж нагадвае і ганебны канец прафесара Шульца, замарожанага ва ўласнай лабараторыі адным з распрацаваных ім снарадаў.

### ЯДЗЕРНАЯ ЗБРОЯ

*Твор: «Сцяг дзіцямі».*

Суперснарад пад назвай «фульгуратар Рока» геніяльна вынаходніка Тама Рока мог знішчыць усё жывое ў радыусе некалькіх кіламетраў. Гэта дакладна адпавядае рэальнай атамнай зброі. Вось толькі ў адрозненне ад рэальнасці ў кнізе гэта вынаходніцтва так і не трапіла ў рукі вайскоўцаў.

### КАМП'ЮТАРЫ І ВІДЭАСУВЯЗЬ

*Твор: «Парыж у XX стагоддзі».*

У сваім раннім рамане-антыўтопіі, напісаным у 1860 годзе, Жуль Верн паказаў сталіцу Францыі ў 60-я гады цяперашняга ўжо мінулага стагоддзя. У гэтым творы вылічальныя аперацыі ў банках праводзілі велізарныя машыны. Такім чынам, пісьменнік прадбачыў стварэнне ЭВМ. Ён таксама апісаў тэлебачанне і зносіны паміж людзьмі на адлегласці пры дапамозе двух экранаў. Раман таксама ўключае ў сябе тэорыю, вядомую як «тэорыя стрымлівання», распрацаваную амерыканскім дыпламатам Джорджам Кенанам у 1940-я. Верн меркаваў, што са з'яўленнем у некалькіх краін зброі, здольнай знішчыць усю планету, войны сыдуць у мінулае. Тут, на жаль, ён вельмі памыліўся.

### ЭЛЕКТРЫЧНАЕ КРЭСЛА

*Твор: «Парыж у XX стагоддзі».*

Стварэнне электрычнага крэсла Жуль Верн прадказаў у тым жа рамане-антыўтопіі. Ён апісаў, як асуджаных на смерць пазбавілі жыцця пры дапамозе магутнага электрычнага разраду ў 1960 годзе. У рэальнасці ўпершыню падобны спосаб пакарання чалавека быў рэалізаваны ў ЗША 6 жніўня 1890 года ў Абернскай турме штата Нью-Ёрк.

Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# АБРЭЗКА АГРЭСТУ ПАСЛЯ ЗБОРУ ЎРАДЖАЮ

**Агрэст — куст, які лёгка пускае новыя парасткі і кожны сезон патрабуе стараннага догляду і своечасовай апрацоўкі расліны. Калі гэтага не рабіць, то галін робіцца вельмі шмат, а выдаляць лішнія парасткі, пакрытыя вострымі калючкамі, — не вельмі проста. Акрамя таго, агрэст любіць святло — ад гэтага наўпрост залежыць якасць ураджаю. Харчаванне, якое атрымлівае расліна з каранёў, раўнамерна размяркоўваецца па галінах. Чым парасткаў больш, тым меншыя плады.**

Абрэзкі агрэсту нельга рабіць стыхійна. Гэты працэс ажыццяўляецца па вызначаных правілах.

Задача садоўніка складаецца ў тым, каб сачыць за канцамі парасткаў, якія адрастаюць, і выдаляць «мёртвыя» галіны. Калі парастковы слабыя і кароткія (менш за 7 см), то іх варта абрэзаць да месца, дзе галіна ўтварыла моцныя і здаровыя адгалінаванні. На тонкіх далікатных канцах ягады ўсё роўна не з'явяцца, затое пажыўныя рэчывы, паступаючы ў верхавінныя пупышкі, забяруць жыццёвую сілу ў больш здаровых парасткаў.



## Што рабіць з нулявымі парасткамі?

Нулявыя парасткамі называюцца галіны, якія растуць каля паверхні зямлі. Іх пажадана абрэзаць на чвэрць. Тады куст пусціць шмат новых парасткаў. Трэба ўважліва агледзець галіны з вонкавага боку. Выявіўшы самую моцную пупышку, парасткі трэба абрэзаць на 10 см вышэй. У гэтым выпадку новая галінка будзе расці вонкі, а не ўглыб.

## Калі лепш займацца абрэзкай агрэсту?

Садоўнікі не любяць рабіць абрэзку вясной, таму што перыяд, дапушчальны для выдалення лішніх парасткаў, вельмі кароткі. Лепш распачынаць работу ўвосень, калі куст «засынае» і працэсы засвоення пажыўных рэчываў у ім запаволваюцца.

Абрэзка агрэсту для ўраджаю добрая тым, што няўзброеным вокам можна заўважыць слабыя і загінулыя галіны і не спяшаючыся іх выдаліць. А вясной застанецца толькі сфарміраваць куст.

## Асаблівасці восеньскай апрацоўкі агрэсту

Вельмі важны догляд агрэсту восенню. Абрэзка праз год пасля пасадкі абавязковая. Усе неабходныя дзеянні трэба завяршыць яшчэ да надыходу халадоў, каб расліна паспела «прыйсці ў сябе» і месцы абрэзаў сталі сухімі. Увосень дазволена выдаленне мёртвых і слабых галін, але не варта караціць парасткі.

Расліна пусціць новыя галінкі, надыдзе мароз, і маладыя галінкі могуць загінуць.

## Што варта рабіць

Дбайны агляд кары дазволіць зрабіць правільныя высновы пра ўзрост галінак.

Счарнелыя, цёмныя, безжыццёвыя парасткі трэба выдаліць адразу ж.

Калі куст шмат гадоў і амаль усе галіны ўжо не пладаносяць, нельга рэзаць усе галіны за адзін заход. Пры сезонным абразанні неабходна пакінуць як мінімум траціну галінак.

Можна смела выдаляць галіны, размешчаныя занадта нізка ці далёка ад асноўнага куста.

Правільнае абразанне агрэсту восенню дазволіць у перыяд актыўнага раставання снегу толькі прыбраць з кустоў падмерзлыя за зіму галінкі, пакараціць тонкія парасткі і абрэзаць тыя, што выраслі каля зямлі.

## Абрэзка агрэсту павінна ажыццяўляцца кожны год

Агрэст пачынае актыўна пладаносіць праз 5-6 гадоў пасля пасадкі куста ў зямлю, таму што першыя гады ідзе фарміраванне каранёвай сістэмы. Ягад яшчэ няма, ліслся мала.

Фарміруючы куст, варта пакідаць па 3-4 нулявыя парасткі. Дзякуючы гэтаму на кусце за 5-гадовы перыяд з'явіцца вялікая колькасць (прыкладна 25) моцных галінак неаднолькавага ўзросту. Праз азначаны перыяд куст агрэсту пачне прыносіць выдатны ўраджай. На працягу 4-5 наступных гадоў ягады будуць багата пакрываць галінкі, а ва ўзросце 8-9 гадоў пачнецца працэс старэння.

Як толькі з зямлі з'яўляецца чарговы парастак, яго трэба зрабіць карацейшым на чвэрць, сачыць, каб усе галіны «грэліся» ў промнях сонца, і не забывацца абразаць галіны, якія імкнуцца прарасці ўглыб куста.

## Чаго не варта рабіць?

Важна не здзяйсняць памылак пры апрацоўцы агрэсту, каб работы папярэдніх гадоў не прайшлі дарэмна.

- Абрэзка агрэсту летам можа скончыцца сумна, таму што новыя парасткі будуць яшчэ занадта далікатныя і слабыя, каб вытрымаць націск першых восеньскіх і зімовых маразоў.
- Калі галінкі пладаносяць, нельга выдаляць іх сёлетнія прыросты. Варта агледзець іх увесну і абрэзаць тыя, што пачарнелі і высахлі. Парастак чарнее, калі яго пашкоджвае мучністая раса, і гіне, калі да маразоў не паспеў пакрыцца шчыльнай светлай карой. Летняя апрацоўка куста зводзіцца да таго, каб у першых числах ліпеня адшчыкнуць верхавінныя пупышкі ў галінак, тым самым перакрываючы паступленне пажыўных рэчываў у самыя верхавіны.

Даты Падзеі Людзі

## 21 ЖНІЎНЯ

У краіне

**1911** год — заснавана Мінская земская балотная даследная станцыя — першая ў Расіі і Беларусі навуковая ўстанова па даследаванні балот. У 1930 годзе на аснове станцыі створаны Усесаюзны НДІ балотнай гаспадаркі.

**1925** год — нарадзіўся Георгій Іванавіч Сідарэнка, беларускі кардыёлаг, акадэмік АН Беларусі, доктар медыцынскіх навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, заслужаны вынаходнік Беларусі. Аўтар больш чым 850 навуковых прац, у тым ліку 10 манаграфій, 165 вынаходак. Асноўныя працы па праблемах кардыялогіі, медыцынскай кібернетыкі і прыборабудавання. Распрацаваў метады індывідуалізацыі лячэбных працэдур, аўтаматызацыі экстраннага аналізу кардыялагічнай інфармацыі, аналізу сардэчна-сасудзістай інфармацыі пры дапамозе ўніверсальных вылічальных машын. Стварыў апараты аўтаматызаванай біякіравальнай дыягностыкі і тэрапіі сардэчна-сасудзістых захворванняў, удзельнічаў у стварэнні новага пакалення лекавых прэпаратаў сардэчна-сасудзістага дзеяння. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь. Памёр у 2014 годзе.

**1949** год — нарадзіўся (вёска Аляксейкі Івацэвіцкага раёна) Сцяпан Сцяпанавіч Пясецкі, беларускі вучоны ў галіне палімернага матэрыялазнаўства, доктар тэхнічных навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі. З 1971 года ў Інстытуце механікі металапалімерных сістэм НАН Беларусі. Аўтар навуковых прац па тэхналогіі палімераў і кампазітаў. Распрацаваў шэраг тэхналогій атрымання новых кампазітных матэрыялаў на аснове палімераў, якія знайшлі прымяненне ў машынабудаванні. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі.

**1970** год — ЦК КПБ і Савет Міністраў БССР прынялі пастанову «Аб мерапрыемствах па нарошчванні тэмпаў і павышэнні тэхнічнага ўзроўню будаўніцтва ў Мінску».

У свеце

**1904** год — нарадзіўся Сяргей Сямёнавіч Бірузоў, ваенны дзеяч, Маршал Савецкага Саюза, Герой Савецкага Саюза. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны дывізія пад яго камандаваннем паспяхова дзейнічала на Паўднёва-Заходнім і Бранскім франтах. З красавіка 1942 года начальнік штаба 48-й арміі, са снежня — 2-й гвардзейскай арміі, якія разграмілі групоўку войскаў праціўніка, што складалася дзеля блакавання акружаную пад Сталінградам армію Паўлюса. З мая 1944-га — начальнік штаба 3-га Украінскага фронту. Пад яго кіраўніцтвам распрацавана Яска-Кішынёўская аперацыя, забяспечана ўзаемадзеянне войскаў фронту пры вызваленні Румыніі, Балгарыі і Белградскай аперацыі. З кастрычніка 1944 года камандуючы 37-й арміяй і галоўны вавенны саветнік пры балгарскай арміі. Загінуў у авіяцыйнай катастрофе ў 1964 годзе. Яго імем названа вуліца ў Мінску.

**1929** год — нарадзілася Вія Артмане, латышская савецкая актрыса, народная артыстка СССР. Здымалася ў фільмах «Родная кроў», «Ніхто не хацеў памяці», «Дзяржаўная граніца», «Тэатр», «Емяльян Пугачоў» і іншых. Памерла ў 2008 годзе. Незадоўга да смерці прыняла праваслаўе з імем Лізавета.

**1944** год — у Вашынгтоне на віле Думбартан-Окс адкрылася міжнародная канферэнцыя, якая падрыхтавала прапановы, што ляглі ў аснову прынятага ў 1945 годзе Статута ААН. Канферэнцыя працавала з 21 жніўня да 7 кастрычніка 1944 года.

**1968** год — з мэтай падаўлення масавых народных хваляванняў у падтрымку працэсу лібералына-дэмакратычных рэформаў у Чэхаславакіі былі ўведзеныя войскі краін Варшаўскага дагавора. Гэта адбылося напярэдадні з'езда кампартыі Чэхаславакіі, на якім рэформы павінны былі атрымаць рашучую падтрымку. З'езд партыі ўсё ж такі быў праведзены, і яго ўдзельнікі выказалі падтрымку пачатым рэформам, але гэта ўжо не мела ніякага значэння — «Пражская вясна» была згорнута.

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Дзёўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 5.57 | 20.27 | 14.30 |
| Віцебск | 5.44 | 22.20 | 14.36 |
| Магілёў | 5.48 | 20.17 | 14.29 |
| Гомель | 5.48 | 20.09 | 14.21 |
| Гродна | 6.13 | 20.41 | 14.28 |
| Брэст | 6.18 | 20.38 | 14.20 |

## Месяц

***Поўня 15 жніўня.***
***Месяц у сузор'і Цяльца.***

## Імяніны

***Пр.*** *Германа, Іосіфа, Леаніда, Мікалая, Мірона, Рыгора.*
***К.*** *Іаанны, Казіміра, Францішка.*

Фота Анатоля КЛЕЦКАЎА.

# ЗАЎТРА




## ...у суседзяў

| ВАРШАВА | КІЕЎ | РЫГА |
|---|---|---|
| +21..+23°С | +24..+26°С | +19..+21°С |
| ВІЛЬНЮС | МАСКВА | С.-ПЕЦЯРБУРГ |
| +20..+22°С | +23..+25°С | +18..+20°С |

УСМІХНЕМСЯ

— Дзядуля, чаму людзі не падаюць з Зямлі, якая круціцца?

— Таму што яны прымацаваныя да палікліній.

**У банку:**

**— Добры дзень. Я хачу адкрыць сусмесны рахунак.**

**— Канешне. З кім?**

**— З кім-небудзь багатым.**

— Сынок, ты пачысціў зубкі?

— Мама, мне ўжо 35 гадоў!

— І што? Цяпер не трэба чысціць зубкі?

**— Што гэта ў вас такое незразумелае: ні рыба, ні мяса?..**

**— Гэта кампот!**

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІК: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА. ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІПЯНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гомелі: 28 27 27, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтарыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by; e-mail: info@zviazda.by, (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваіх меркаваннях адбірае і публікуе адрасаваныя ёй лісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар.

Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета адрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2795.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 20 жніўня 2019 года.